

Доўгатэрміновыя ўкладанні ў здароўе.

СТАР. 3



Як дасягнуць поспеху ў супрацьдзеянні наркотыкам.

СТАР. 4



Касмічныя атракцыён у мінскім аквапарку.

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

7 мая 2014 г. СЕРАДА № 83 (27693) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# «ДАРОЖНАЯ КАРТА» СЕЛЬГАСВЫТВОРЧАСЦІ

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка патрабуе выпрацоўкі і рэалізацыі комплексу мер па павышэнні эфектыўнасці работы аграпрамысловага комплексу

**Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў, заслухоўваючы даклад аб выніках работы міжведамаснай рабочай групы для вырашэння праблемных пытанняў у АПК, паведамляе БЕЛТА.**

Прэзідэнт нагадаў, што сфера сельскай гаспадаркі не адзіная, дзе было даручана комплексна вывучыць і ліквідаваць існуючыя праблемы. «Падобным чынам мы паспрабавалі прааналізаваць, і быццам бы атрымалася (паглядзім, што на практыцы будзе), будаўнічую галіну, прынялі адпаведнае рашэнне. Хачу нагадаць, Андрэй Уладзіміравіч (кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй Кабякоў. — заўвага БЕЛТА ), што 1 ліпеня ў нас час «Ч»: мы павінны выканаць усё, што мною было сказана на нарадзе, чаго б нам гэта ні каштавала», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Як адзначыў Прэзідэнт, насельніцтва таксама хвалююць пытанні развіцця жыллёва-камунальнага абслугоўвання. Вывучэннем гэтай сферы займаецца рабочая група на чале са старшынёй КДК Аляксандрам Якабсонам.

Што тычыцца трэцяга кірунку — сферы сельскай гаспадаркі, то, па словах кіраўніка дзяржавы, там не ўсё гладка і, самае галоўнае, няма неабходнай аддачы і эфектыўнасці ў працы сельгаспрадпрыемстваў. Прэзідэнт адзначыў, што частка пытанняў, якія тычацца прычын сітуацыі ў сельскай гаспадарцы, ляжыць на паверхні, але ёсць і некаторыя іншыя, у тым ліку скрытыя прычыны, як складаныя, так і простыя. Выявіць іх і прапанаваць шляхі рашэння было даручана міжведамаснай рабочай групе на чале з прэм'ер-міністрам. «Гэтая група павінна была выявіць прычыны неэфектыўнага функцыянавання (калі браць у цэлым) сельскай гаспадаркі ў плане аддачы ад тых інвестыцый, якія туды накіраваны. І, па-другое, самае галоўнае — нам трэба акрэсліць шляхі выхаду з гэтай сітуацыі. Не проста выхаду, а шляхі эфектыўнага развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці і ўсяго, што з ёй звязана», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

«Аграрная» група на чале з Міхаілам Уладзіміравічам (Мясніковічам) прапрацавала гэтыя пытанні і прапанавала нейкую дарожную карту, якую мы павінны рэалізаваць у Беларусі ў сферы сельскай гаспадаркі, каб ужо ў гэтым і наступным годзе мы ўбачылі хоць нейкія вынікі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым Прэзідэнт папрасіў дакладчыкаў не паглыбляцца ў нюансы і дэталі: «Мы павінны людзям шчыра сказаць: «Вось што мы зробім, а вось што ад вас чакаем і вы абавязаны зрабіць».

# СТРАТЭГІЧНЫ ПУНКТ ПАМІЖ АЗІЯЙ І ЕЎРОПАЙ

**Беларусь абмяркоўвае рэалізацыю сумесных праектаў у высокатэхналагічных галінах з Міжнародным фондам супрацоўніцтва і партнёрства Чорнага мора і Каспійскага мора. Пра гэта ішла размова на сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з прэзідэнтам гэтага фонду Ісмаілам Сафі, паведамляе БЕЛТА.**

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь вельмі зацікаўлена ў развіцці высокатэхналагічных навукаёмістых галін. «На гэтую пяцігодку і будучую мы вызначылі галоўным кірункам развіцця апору на навуку, на сучасныя тэхналогіі. Мы, вядома, зацікаўлены ў тым, каб перспектывы ляжалі ў такіх сферах, як нанаэлектроніка, захоўванне і назапашванне электраэнергіі і іншыя. Гэта тое, чым прыкладна займаецеся і вы», — сказаў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да замежнага госця.

Кіраўнік дзяржавы запэўніў, што гатовы аказаць усялякую падтрымку ў рабоце фонду ў Беларусі. «Я гарантую ўсялякую падтрымку вашага фонду. Вы ведаеце маю палітыку, мы ў гэтых адносінах абсалютна празрыстыя і сумленныя. Мы хацелі б, каб тое, што вы абяцаеце, было рэалізавана», — сказаў ён.

У сваю чаргу, Ісмаіл Сафі падзякаваў Прэзідэнту Беларусі за прадастаўленыя перспектывы актыўнага супрацоўніцтва. Ён звярнуў асаблівую ўвагу на геаграфічнае становішча Беларусі, якая знаходзіцца ў стратэгічнай кропцы і звязвае Азію і Еўропу.

Міжнародны фонд прапануе рэалізаваць у Беларусі інавацыйны праект, які прадугледжвае падпраекты ў галіне электронікі (вытворчасць прыбораў), энергетыкі (вытворчасць нанавугляродных валокнаў для ліній электраперадач), дарожнага будаўніцтва (аблегчаныя будаўнічыя канструкцыі), а таксама выраб рухавікоў на вадародным паліве.

## ПРЭЗІДЭНТЫ АБМЕРКАВАЛІ ШЫРОКІ СПЕКТР ПЫТАННЯЎ ДВУХБАКОВАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА

**Адбылася тэлефонная размова Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным, у час якой быў абмеркаваны шырокі спектр пытанняў двухбаковага супрацоўніцтва. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка беларускай дзяржавы.**

«У бліжэйшы час гэтыя тэмы стануць прадметам абмеркавання ва ўрадах дзвюх краін, а таксама на вышэйшым узроўні», — адзначылі ў прэс-службе.

# ДНЯПРОЎСКІЯ ВАРТАВЫЯ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Быхаўская міжраённая інспекцыя Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь у гэтыя майскія дні вядзе ўзмоцнены кантроль за выкананнем правілаў рыбнай лоўлі і штодзённа патрулюе на вадаёмах Быхаўскага і суседняга з ім Слаўгарадскага раёна. Каб нераст рыбы праходзіў у спрыяльных умовах, сезонная забарона лоўлі будзе доўжыцца па 30 мая.**

**— Асабліва важнымі ўчасткамі для нашых рэйдаў з'яўляюцца рэчышчы і поймы рэк Дняпро і Сож у непасрэднай блізкасці да райцэнтраў і іншых населеных пунктаў, тэрыторыя ландшафтнага заказніка «Старыца», вадасховішча «Чыгірынскае» і іншыя вадаёмы, — кажа намеснік начальніка Быхаўскай інспекцыі Уладзімір Руднеў. — На жаль, браканьерства ў нашым грамадстве яшчэ мае месца. Нярэдка нам даводзіцца выцягваць з вады сеткі, сеткавыя пад'ёмнікі, «павукі», «тэлевізары» і іншыя забароненыя снасці. І асабліва ўражвае, што гэта мы выяўляем нават у дні інтэнсіўнага нерасту.**

**НА ФОТАЗДЫМКУ: намеснік начальніка інспекцыі Уладзімір РУДНЕЎ (злева) і дзяржаўны інспектар Аляксандр БОСЫ ў час чарговага рэйду на старым рэчышчы Дняпра.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей НАВІЦКІ, намеснік старшыні Савета па развіцці прадпрымальніцтва:**

***«Уступаючы ў Еўразійскі эканамічны саюз (ЕАЭС), Беларусь і, у прыватнасці, рэальны сектар яе эканомікі павінны быць гатовы да жорсткай канкурэнцыі, якая з часам будзе толькі нарастаць. Таму галоўнае, што мы павінны зрабіць, — гэта павялічыць эфектыўнасць нашых прадпрыемстваў і максімальна павысіць якасць тавараў і паслуг. Гэта адзіны шанц на выжыванне ў новым інтэграцыйным аб'яднанні. Паколькі, у адрозненне ад сваіх партнёраў па саюзе — Расіі і Казахстана, Беларусь не мае ўласных энерганосьбітаў, яна павінна максімальна выкарыстоўваць свае веды і прапаноўваць якасныя паслугі».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 07.05.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9990,00 | ■ |
| Еўра | 13900,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 280,00 | ■ |
| Укр. грыўня | 855,67 | ▲ |

■ Будзь у курсе

# ЗНІЖКІ ДА ДНЯ ПЕРАМОГІ І НА ПРАЦЯГУ МАЯ

**Напярэдадні Дня Перамогі гандлёвыя арганізацыі разам з прамысловымі прадпрыемствамі і пастаўшчыкамі правядуць акцыі па зніжэнні цэн, прадаставяць бясплатныя дадатковыя паслугі, прапануюць шырокі спектр сувенірнай і тэматычна аформленай прадукцыі, паведамілі ў галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама.**

ААТ «ЦУМ Мінск» 8 і 9 мая прадаставіць ветэранам і прыраўнаваным да іх катэгорыям асоб зніжку 15 працэнтаў на ўвесь асартымент нехарчовых і харчовых тавараў (акрамя рэгулюемых). УП «Універмаг «Беларусь» 8 мая для ўсіх пакупнікоў зніжае цэны на 15 працэнтаў на ўсе прамысловыя тавары коштам больш за 10 тысяч рублёў. 9 мая ветэранам, інвалідам і ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, воінам-інтэрнацыяналістам прадастаўляецца зніжка 15 працэнтаў на ўсе прамысловыя тавары, бясплатныя паслугі па падгонцы швейных вырабаў, раскроі тканіны. ТАА «Гандлёвы дом «На Нямізе» 8 мая ўручыць падарункі членам сем'яў ваеннаслужачых, загінулых у Афганістане.

ААТ «ГУМ» па 11 мая праводзіць для ветэранаў акцыю са зніжэннем цэн на нехарчовыя тавары 25 працэнтаў (зніжка даецца на падставе купона, які можна атрымаць у інфацэнтры ўнівермага пры прад'яўленні адпаведнага пасведчання).

УП «Кірмаш» 9 мая дае зніжку 10 працэнтаў на ўсе нехарчовыя тавары. ЗАТ «ФОМ «Луч» па 10 мая абяцае зніжку 20 працэнтаў на абутак айчыннай вытворчасці і ўпакоўку пакупак у пакеты з фірменнай сімволікай.

Гандлёвыя арганізацыі сталіцы ў маі правядуць рэкламныя акцыі з уручэннем падарункаў і сувеніраў, прапануюць усім пакупнікам шырокі асартымент тавараў па суперцэнах са зніжкай 15-40 працэнтаў (40 працэнтаў — на мужчынскія кашулі ААТ «Эліз», асобныя мадэлі мужчынскага і жаночага адзення ЗАТ «КіС», 35 працэнтаў — на асартымент трыкатажных вырабаў ААТ «Алеся», 20 працэнтаў — на асартымент абутку ад «Сівельгі», «Отыкі», «Белкельме», тэлевізары «Гарызонт», ювелірныя вырабы ААТ «Гомельскае ВА Крыстал» і г.д.).



У правядзенні перадсвяточных мерапрыемстваў удзельнічаюць і айчынныя прадпрыемствы прамысловасці. ААТ «Стужка» пры набыцці прадукцыі на суму ад 200 тысяч рублёў уручае падарунак — 6 сурвэтак, ад 250 тысяч рублёў — 12 сурвэтак. Гэта ж прадпрыемства прадстаўляе шырокі асартымент прадукцыі з нацыянальнай і дзяржаўнай сімволікай.

ЗАТ «Добрушскі фарфоравы завод» выпусціў серыю кубкаў да Дня Перамогі з адпаведнай тэматыкай. У маі ў гандлёвых арганізацыях горада і фірменных секцыях пройдзе акцыя з уручэннем сувеніраў пры набыцці фарфоравага посуду на суму ад 150 тысяч рублёў. ААТ «Шклозавод «Нёман» таксама пастаўляе прадукцыю ў святочным афармленні з адпаведнай тэматыкай, а на працягу мая ў фірменнай сетцы прадпрыемства ўстаноўлена зніжка 20 працэнтаў на ўсю прадукцыю завода.

Аршанскі льнокамбінат у сваіх фірменных крамах праводзіць акцыю «Чырвоная цана» са зніжэннем гандлёвай надбаўкі на 20 працэнтаў на асобныя камплекты пасцельнай бялізны.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# КРЫЛАТЫЯ АГРЭСАРЫ




Прафілактычныя мерапрыемствы, скіраваныя супраць восаў і шэршняў, трэба праводзіць зараз

**Цяжка знайсці чалавека, які б ні разу ў жыцці не бачыў прымацаваны да якойсьці паверхні на ўчастку шэры «пузыр», вакол якога лётаюць восы або шэршні. І часта гэта адбываецца з-за элементарнай нядбайнасці. Таму прафілактыкай трэба заняцца ў маі, каб у ліпені ці жніўні не атрымаць пад бокам нечаканы сюрпрыз у выглядзе гнязда з насякомымі.**



— Восы і шэршні будуюць гнёзды не за ноч, а на працягу некалькіх месяцаў, — гаворыць **памочнік міністра па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ.** — Для свайго будучага жытла яны выбіраюць цёмныя, халаднаватыя, зацішныя месцы. У прыватных дамах і гаспадарчых пабудовах гэта гарышчы, падвалы, закуткі, за якімі не сочаць не вельмі дбайныя гаспадары. З дапамогай мантажнай пены або будаўнічых сумесяў трэба ліквідаваць не толькі ўсе шчыліны, праз якія няпрошаныя госці могуць забрацца ў будынак, але і перакрыць шлях у схаваныя поласці, якія могуць утварацца пад падлогай ці вагонкай. У шматпавярховых дамах небяспечныя насякомыя любяць будаваць гнёзды паміж стыкамі бетонных пліт.

Што адметна, мегаполіс чамусьці больш прыйшоўся даспадобы менавіта восам. Летась сталічныя ратаўнікі выязджалі змагацца з імі 282 разы, і толькі чатыры рэйсы былі скіраваны супраць шэршняў... Пры гэтым па краіне на іх долю прыходзіцца чвэрць выездаў. Увогуле, задача па ліквідацыі гнёздаў небяспечных насякомых была ўскладзена на нашы падраздзяленні ў мінулым годзе.

СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### СБУ: СУПРАЦЬ КАНДЫДАТАЎ У ПРЭЗІДЭНТЫ РЫХТУЕЦЦА ТЭРАКТ



Служба бяспекі Украіны папярэдзіла кандыдата ў прэзідэнты Юлію Цімашэнку, што супраць яе рыхтуецца тэракт. Пра гэта распавяла «Укрінформ» прэс-сакратар палітыка Марына Сарока. «Нягледзячы на гэта, Юлія Цімашэнка не перапыніла рабочую паездку ў Мікалаеўскую вобласць», — адзначыла прэс-сакратар. Паводле яе слоў, папярэджанне паступіла ў ноч на 6 мая. У СБУ пацвердзілі гэтую інфармацыю, адзначыўшы, што ёсць пагроза жыццю не толькі Цімашэнкі. «Мы сапраўды атрымалі інфармацыю аб пэўнай небяспецы некалькім палітыкам падчас іх паездак у паўднёвыя і ўсходнія рэгіёны. У тым ліку сярод гэтых палітыкаў ёсць некалькі кандыдатаў у прэзідэнты. Усім ім аб гэтым (аб пагрозе) паведамілі», — цытуе работнікаў прэс-цэнтра СБУ «Украінская праўда». Інфармагенцтвам стала вядома, што інфармацыя пра пагрозу для жыцця датычыцца таксама кандыдата ў прэзідэнты, дэпутата парламента Пятра Парашэнкі. Ён і Цімашэнка лічацца фаварытамі прэзідэнцкай гонкі.

### КАБ ЗАХАВАЦЬ ПАМЯЦЬ, ВАРТА ЦВЁРДА ПРЫТРЫМЛІВАЦЦА РЭЖЫМУ СНУ



Рэжым сну ў сярэднім і сталым узросце наўпрост звязаны з якасцю памяці. Паводле слоў супрацоўнікаў Брыгамскага жаночага шпіталя, калі чалавек спіць вельмі многа ці вельмі мала, гэта адназначна негатыўна адаб'ецца на памяці ў далейшым, піша Business Standard. Так, жанчыны, якія спалі па 5 гадзін і менш або па 9 гадзін і больш у дзень, мелі пагаршэнне памяці, эквівалентнае старэнню мозга на два гады. Ідэальны рэжым сну — 7 гадзін у дзень. Калі ж працягласць сну з часам змяняецца больш чым на дзве гадзіны, то гэта таксама нашкодзіць памяці. Навукоўцы раяць не змяняць працягласць сну на працягу жыцця, пастаянна прытрымлівацца аднаго выбранага рэжыму, каб засцерагчы сябе ад кагнітыўных парушэнняў. Раней супрацоўнікамі Амерыканскай акадэміі медыцыны сну было ўстаноўлена, што лішнія гадзіны сну правакуюць развіццё дыябету, сардэчных захворванняў, трывожнасці і атлусцення. Паводле слоў навукоўцаў, аптымальная колькасць гадзін сну скарачае рызыку гэтых захворванняў і паляпшае стан здароўя людзей, старэйшых за 45 гадоў.

ISSN 1990 - 763X

14083

9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### У ІРАКУ ЛЕГАЛІЗУЮЦЬ ШЛЮБЫ З ДЗЕВЯЦІГАДОВЫМІ?



У Іраку прайшлі першыя з моманту вываду амерыканскіх войскаў парламенцкія выбары. Хоць іх афіцыйныя вынікі будуць падведзены толькі ў канцы мая, ужо цяпер з вялікай доляй верагоднасці можна сказаць, што пераможцам стане цяперашні прэм'ер, шыіт Нуры аль-Малікі. Між тым, адным з перадвыбарных абяцанняў яго кабінета было прыняцце «Закона Джафары» аб асабістым статусе, які дазваляе жаніцца з маленькімі дзяўчынкамі. Цяпер шлюбны ўзрост у Іраку складае 18 гадоў. З дазволу апекуноў уступіць у шлюб можна і ў 15. Такі парадак у краіне існуе з 1959 года. Аднак, паводле «Закона Джафары», шлюбны ўзрост для юнакоў павінен быць зніжаны да 15 гадоў, а для дзяўчат (дакладней дзяўчынак) — да дзевяці! Больш за тое: дзяўчынкі, маладзейшыя за дзевяць гадоў, таксама могуць выходзіць замуж, але толькі з дазволу бацькі або дзеда.

КОРАТКА

Пагадненне паміж урадамі Беларусі і Турцыі аб узаемнай адмене віз уступіць у сілу сёлета з 1 чэрвеня. Гэта азначае, што беларускія грамадзяне змогуць знаходзіцца на тэрыторыі Турцыі на працягу 30 дзён, не афармляючы візы. На працягу аднаго года можна будзе ўязджаць у Турцыю без візы шматразова, але агульны тэрмін такога знаходжання не павінен перавышаць 90 дзён.

IX Беларускі міжнародны медыяфорум пройдзе 8-12 чэрвеня пад дэвізам «Партнёрства ў імя будучыні: рэаліі глабальнага свету». Свой удзел у мерапрыемстве пацвердзілі ўжо 20 краін.

Галоўным трэнерам новага клуба экстралігі чэмпіянату Беларусі па хакеі «Дынама-Маладзечна», які пачне выступленне з сезона 2014/15, назначаны Дзмітрый Краўчанка.

Больш як сто адвакатаў Беларусі ў час ЧС-2014 гатовы аказаць юрыдычную дапамогу замежным гасцям і правесці кансультацыі на іх роднай мове. Поўны спіс адвакатаў, якія свабодна валодаюць замежнымі мовамі, размешчаны на сайце РКА — www.rka.by.

Святочны салют 9 мая, прысвечаны 69-й гадавіне Перамогі, у Мінску пачнецца ў 23.00. Правядзенне салюту пераносіцца на цёмны час сутак для больш відовішчнага і поўнамаштабнага ўспрымання.



# ЭКСТРАННЫЯ СЛУЖБЫ ДА СВЯТ ГАТОВЫ

## Падчас урачыстых мерапрыемстваў парадак будзе забяспечаны

**Святкаванні, прысвечаныя 69-й гадавіне Перамогі, пройдуць 9 мая па ўсёй Беларусі. Акрамя таго, у гэты дзень пачнецца і чэмпіянат свету па хакеі. Натуральна, што на плечы сілавікоў будзе ўскладзены двайны цяжар па забеспячэнні грамадскага парадку.**

— У месцах масавых мерапрыемстваў будуць арганізаваны кантрольна-прапускныя пункты, — гаворыць **начальнік упраўлення аховы правапарадку Міністэрства ўнутраных спраў Іван КУБРАКОЎ.** — Допуск грамадзян у месцы масавых гулянняў будзе ажыццяўляцца пасля правядзення агляду з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў. Мы заклікаем усіх людзей, у тым ліку і замежных гасцей, ставіцца да гэтага з разуменнем. Усе гэтыя меры перш за ўсё накіраваны на бяспеку. Тым больш што гэта агульнасусветная практыка.

Не пусціць на мерапрыемствы людзей нападпітку. Спіс забароненых для праносу прадметаў будзе размешчаны каля кожнага кантрольна-прапускнога пункта. Азнаёміцца з ім на сайце Міністэрства ўнутраных спраў можна ўжо цяпер. Меры бяспекі 9 мая будуць узмоцнены не толькі ў сталіцы, дзе адбудуцца найбольш масавыя гулянні, але і па ўсёй краіне. Так, стане больш нарадаў патрульна-паставой службы, а таксама ДПС ДАІ.

У інтэрнэце ж з'явіліся чуткі аб тым, што 9 мая расійскія балельшчыкі нібыта маюць намер правесці ў Мінску «рускі марш». Падобная акцыя адбылася ўлетку 2012 года ў Варшаве падчас чэмпіянату Еўропы па футболе. Скончылася ж яна тады масавымі беспарадкамі.

— Ніякага «рускага маршу» ў Мінску не будзе, — падкрэсліў Іван Кубракоў. — У органы ўнутраных спраў ніхто з расійскіх балельшчыкаў заяўку на правядзенне шэсця 9 мая не падаваў. Інфармацыя аб намерах правесці такую акцыю ёсць у інтэрнэце. Яна пільна адсочваецца і трымаецца на кантролі. Органы ўнутраных спраў краіны прадпрымуць усе меры бяспекі, каб не дапусціць парушэння грамадскага парадку.

На ўзмоцнены варыянт нясення службы падчас масавых мерапрыемстваў пераведзены і падраздзяленні МНС.

— У сталіцы будуць створаны аператыўныя штабы па кантролі за сітуацыяй, — гаворыць **намеснік начальніка ўпраўлення аварыйна-выратавальных службаў і ліквідацыі надзвычайных сітуацый МНС Беларусі Анатоль БАЛЯБІН.** — У месцах масавых гулянняў і запуску святочных салютаў ратаўнікі сканцэнтруюць дадатковыя сілы і сродкі. А на акваторыі Свіслачы ва ўзмоцненым рэжыме вахту будуць несці работнікі таварыства ратавання на водах.

Ратаўнікам, медыкам і міліцыянерам дапамогуць і валанцёры, якія добра валодаюць англійскай мовай. Яны будуць працаваць на адзіным тэлефонным нумары экстраннай дыспетчарскай службы — 112.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

■ Камунальныя паслугі

# КОШТ КІЛАВАТА: ЦІ ПА КІШЭНІ?

**Летась у нашай краіне грамадзяне сталі плаціць за электраэнергію ў 2 разы больш. І для многіх гэты скачок цаны стаў шокам. Пры гэтым мы цяпер аплачваем менш за 80% ад рэальнай цаны кілавата. Астатняе пакуль што пералічвае энергетыкам дзяржава. Ужо вядома, што ў наступным годзе насельніцтва будзе плаціць за электрычнасць столькі, колькі яно каштуе. Ці зробяць энергетыкі ўсё магчымае, каб кілават не біў па кішэнях беларусаў? Ці могуць панізіць выдаткі пры выпрацоўцы электрычнасці? Гэтыя і іншыя пытанні абмяркоўваліся падчас выязнога пасяджэння працоўнай групы па вывучэнні праблемных пытанняў жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Групу ўзначальваў старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Аляксандр Якабсон. Падчас пасяджэння высветлілася, што, на жаль, паміж камунальнікамі і энергетыкамі няма ўзаемаразумення.**



Тут знаходзіцца новы блок станцыі.

## Станцыя: сёння і заўтра

Мерапрыемства адбылося ў Новалукомлі. Напачатку Аляксандр Якабсон, міністры энергетыкі і ЖКГ і іншыя адказныя асобы наведалі флагман беларускай энергетыкі Лукомльскую ДРЭС.

45 гадоў таму на станцыі запусцілі першы блок. Магутнасць станцыі — больш за 2 тыс. 460 МВт. Яна выпрацоўвае ў год каля 30% усёй электраэнергіі, якая спажываецца ў краіне. На станцыі працуюць каля 1,8 тысячы чалавек.

— Пасля ўводу ў эксплуатацыю новага блока, устаноўленага кітайскімі спецыялістамі (а ён цяпер працуе ў праверачным рэжыме), магутнасць дзеючай станцыі павялічыцца прыкладна на 20%. Адрозненне гэтага блока ад нашых у тым, што ён — цалкам па новай тэхналогіі. Пасля мадэрнізацыі чатырох нашых энергаблокаў мы дасягнулі добрай эканоміі. А новы блок яшчэ больш эфектыўны: дае магчымасць на трэць эканоміць паліва, — расказвае **Аляксандр БАЗЫЛЕНКА, дырэктар Лукомльскай ДРЭС.**



Лічыльнік, куды кідалі манеты.

**Краіна мае права разлічваць, што ўкладзеныя ў энергетыку велізарныя грошы наблізяць нас да Еўропы па паказчыках энергаёмістасці валавога ўнутранага прадукту.**

Кітайскі блок устаноўлены ў асобным будынку. Кітайскія спецыялісты ветліва сустрэлі членаў выязнога пасяджэння пры ўваходзе. Раздалі каскі (дарэчы, нямецкай вытворчасці. — **Аўт**.). Новы блок — гэта сённяшні дзень сусветнай энергетыкі: і звонку, і ўнутры. Умовы для працы апаратараў і іншых спецыялістаў, якія абслугоўваюць турбіну, вельмі адрозніваюцца ад тых, што ў старым корпусе станцыі. Пакуль блок не запрацаваў на поўную магутнасць (адбудзецца гэта напрыканцы мая), разам яго абслугоўваюць беларускія і кітайскія спецыялісты.

## Зона празрыстасці

Пасля экскурсіі па станцыі адбылася размова на тэму развіцця энергетыкі краіны і павышэння платы за тарыфы.

— Тое, што зроблена на станцыі, пакінула самае прыемнае ўражанне: шмат нечаканага, новага, я б сказаў, радыкальнага. На гэтым і іншых аб'ектах энергетыкі вырабляюцца тыя нябачныя кілаваты, без якіх не можа функцыянаваць эканоміка. У цэлым у энергетычную галіну краіна ўкладвае велізарныя грошы. З 2012 па 2016 год на развіццё энергетычнай сістэмы запланавана накіраваць каля 5 мільярдаў долараў. Таму краіна мае права разлічваць, што ўкладзеныя ў энергетыку такія велізарныя грошы наблізяць нас да развітых еўрапейскіх краін па паказчыках энергаёмістасці валавога ўнутранага прадукту і будуць спрыяць павышэнню канкурэнтаздольнасці эканомікі... Але на практыцы мы па-ранейшаму адстаём ад Еўропы. За намі — толькі Расія і Украіна. У асноўным гэта звязана з эксплуатацыяй старога і неэфектыўнага абсталявання, — звярнуўся да прысутных Аляксандр Якабсон.

Ён нагадаў, што летась у красавіку сітуацыя ў энергетыцы стала прадметам разгляду на нарадзе ў Прэзідэнта. Асаблівая ўвага надавалася адсутнасці ў энергетычнай галіне аб'ектыўнага і празрыстага механізму фарміравання тарыфаў на паслугі па энергазабеспячэнні.

— Калі параўнаць новыя тарыфы на электраэнергію ў снежні 2013 года са снежнем 2012 года, іх рост склаў больш чым 200%. І гэта толькі за адзін год. З усіх камунальных паслуг — самы высокі рост цаны. Ці гатова насельніцтва да такіх рэзкіх павышэнняў? Ці адпавядаюць крокі энергетыкаў па павышэнні тарыфаў фінансавым магчымасцям людзей? У адпаведнасці з праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны да 2015 года неабходна забяспечыць узровень кампенсацыі насельніцтвам затрат на электразабеспячэнне да ўзроўню сабекошту. Як дасягнуць запланаванага пры абмежаванні па штогадовым павелічэнні кошту камунальных паслуг — не больш чым 5 долараў? — спытаў Аляксандр Якабсон.

Ці не прасцей менш купляць газ, а больш — электраэнергіі за мяжой? На гэтае пытанне, як адзначыў Аляксандр Якабсон, таксама не было дадзена зразумелага адказу.

У выніку было прынята рашэнне сабрацца зноў, каб нарэшце прыйсці да кансенсусу. І, безумоўна, грамадзяне павінны ведаць, што цана на святло, цяпло і іншае — празрыстая.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота аўтара.**

*Навалукомль — Віцебск*

Электронныя прыборы ўліку святла робяць у Віцебску, Брэсце... Напэўна, грамадзяне і не ведаюць, што яны дазваляюць захоўваць адпаведную інфармацыю на працягу некалькі гадоў.

Прадстаўнікі «Віцебскэнерга» расказалі, што з усіх 576 тысяч чалавек, адказных за аплату электраэнергіі (на мове энергетыкаў, бытавых абанентаў. — **Аўт**.), 41 тысяча могуць нават не падыходзіць да лічыльнікаў, каб зняць паказанні. Бо разумная тэхніка сама перадае інфармацыю аб тым, колькі спажылі электраэнергіі — у банкі, інфармацыйныя кіёскі, на пошту і гэтак далей. Але такая зручнасць — толькі для жыльцоў новых дамоў і тых, хто жыве ў дамах пасля рэканструкцыі (калі ў доме больш за 20 кватэр. — **Аўт**.).

# КРЫЛАТЫЯ АГРЭСАРЫ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Як ліквідаваць гняздо?

На прысядзібным участку жыхара Добруша завяліся шэршні. Паступова яны звілі вялікае гняздо. Гаспадар жа захацеў збіць яго самастойна. Пачаў стукаць па гняздзе — і тут жа рой з соцень насякомых рынуўся ў атаку. Мужчына кінуўся наўцёкі, але два шэршні яго дагналі і ўджалілі ў спіну і галаву. Чалавек паспеў толькі сказаць жонцы, што адбылося, як тут жа пачаў задыхацца — у яго імгненна развіўся анафілактычны шок. «Хуткай» жа толькі засталося канстатаваць смерць пацярпелага. Гняздо ж урэшце здымалі супрацоўнікі МНС...

— Ракавая памылка нябожчыка была ў тым, што ён пачаў стукаць па гняздзе, — аналізуе сітуацыю Віталь Навіцкі. — Шэршні ўспрынялі яго як пагрозу, якая хоча разбурыць іх дом, і перайшлі ў наступ... Насамрэч пазбавіцца ад гнязда шэршняў ці восаў не так складана. Па-першае, усе работы неабходна праводзіць позна ўвечары або ўначы, бо пасля заходу сонца актыўнасць насякомых рэзка зніжаецца. У адным кокане могуць жыць да сямісот шэршняў! Па-другое, трэба сябе загадзя максімальна абараніць. Не павінна застацца ніводнага адкрытага ўчастка цела, а вопратка павінна быць шчыльна запраўлена. На гняздо надзяваюць адзін ці два шчыльныя мяшкі, і вострым нажом ці шпацелем хутка аддзяляюць яго ад прадмета, за які яно мацуецца. Мяшок са смяротна небяспечным грузам трэба тут жа ўтылізаваць — утапіць або спаліць, выконваючы пры гэтым правілы пажарнай бяспекі. А вось з ужываннем у закрытым памяшканні інсектыцыдаў кшталту вядомага ўсім дыхлафосу трэба быць вельмі асцярожнымі з-за таго, што яны шкодныя і для чалавека. Таму, перш чым распыліць ядахімікат, уважліва прачытайце інструкцыю. І зноў жа, пасля ліквідацыі гнязда згаданыя вышэй прафілактычныя мерапрыемствы ніхто не адмяняў. Хто дасць гарантыю, што гэтае месца не прыйдзецца даспадобы іншаму рою насякомых з джаламі?

**Летась ратаўнікі 3760 разоў выязджалі на ліквідацыю гнёздаў джаланосных насякомых.**

Аднак трэба памятаць пра небяспеку анафілактычнага шоку, асабліва тым людзям, якія пакутуюць на алергію. Многія людзі да таго ж і палохаюцца такіх насякомых. Таму лепш за ўсё даверце ліквідацыю небяспечнага гнязда спецыялістам. Яны зробяць гэта бяспечна, хутка, прафесійна і надзейна. Між іншым, методыка працы ратаўнікоў істотна і не адрозніваецца.

## Застацца ў жывых

Але небяспека можа падсцерагаць не толькі ў галінах дрэў або ў закутках пабудоў. Шэршні, апроч іншага, могуць гнездавацца і ў зямлі. Патрывожыць іх можна вельмі проста, неспадзявана наступіўшы на гняздо. Да таго ж іх укус нашмат больш балючы, чым укус асы ці пчалы. Акрамя таго, шэршань можа ўджаліць чалавека некалькі разоў. Летась гэтыя насякомыя разбушаваліся ў кітайскай правінцыі Шаньсі, дзе ад іх укусаў загінулі дзясяткі чалавек... Збіраюць крылатыя агрэсары ахвяр і ў Беларусі.

Асабліва жудасным выдалася лета 2008 года ў Магілёўскай вобласці. У госці да сваякоў прыехаў масквіч. Разам яны пайшлі па грыбы і наткнуліся на гняздо шэршняў. Чалавека не выратавалі... У Быхаве ж тады шэршні забралі жыццё 40-гадовага кіроўцы мясцовага ПМК, які падчас адпачынку на беразе ракі палез па галлё на дрэва.

**Ліквідацыю жытла насякомых праводзяць толькі ў цёмны час сутак.**

— Самае галоўнае правіла бяспекі — гэта трымацца як мага далей ад гнёздаў, — раяць ратаўнікі. — Звычайна восы і шэршні першымі не нападаюць, калі іх не правакаваць — не дакранацца да «дома», не размахваць рукамі, намагаючыся адагнаць насякомае. Майце на ўвазе, што даць драла ад іх не атрымаецца. Яны лятаюць куды хутчэй, чым вы бегаеце. Да таго ж аб'ектам для нападу для іх з'яўляецца рухомая цэль. Таму, калі вы нечакана наткнуліся на гняздо, паціху адыходзьце, не кідайцеся наўцёкі. Акрамя таго, пчолаў і восаў узбуджае пах адэкалону. І абавязкова растлумачце небяспеку дзецям. Для малых вынікі ўкусаў джаланосных насякомых могуць быць яшчэ горшымі, чым для дарослых.

Калі ж атакі пазбегнуць не ўдалося, трэба максімальна хутка выдаліць са скуры джала. Зрабіць гэта можна любым падручным прадметам — пінцэтам, пазногцем, тупым бокам ляза нажа ці нават пластыкавай банкаўскай карткай. Да месца ўкусу неабходна прыкласці халодны прадмет. Калі чалавек у свядомасці, то дайце яму супрацьалергенны прэпарат — супрасцін, цэтырызін, кетатыфен, ларатадын. Прымяняць іх трэба і пры анафілактычным шоку, які ўяўляе для чалавека найбольшую небяспеку. У пацярпелага рэзка падае артэрыяльны ціск, скура мяняе колер, яго кідае ў халодны пот, пачынаюцца сутаргі і ўрэшце чалавек губляе прытомнасць. У такім выпадку трэба неадкладна выклікаць «хуткую дапамогу». Калі на соннай артэрыі прамацваецца пульс, то пакусанага неабходна павярнуць на бок. А калі і пульсу няма, трэба неадкладна праводзіць сардэчна-лёгачную рэанімацыю. Сачыць жа за станам здароўя ўджаленага трэба да прыезду брыгады медыкаў...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

### Цана пытання

— Надзвычайнай такая сітуацыя не лічыцца, таму за тое, каб ратаўнікі прыбралі гняздо, хутчэй за ўсё давядзецца заплаціць. Пры гэтым трэба зазначыць, што кожны выпадак разглядаецца індывідуальна. Калі восы, шэршні ці пчолы пабудавалі гняздо на тэрыторыі сацыяльнага аб'екта — школы, дзіцячага садка, бальніцы — выезд на яго знішчэнне бясплатны. Пры іншым раскладзе спагнанне платы будзе залежыць ад таго, ці ўяўлялі раз'юшаныя насякомыя прамую небяспеку для людзей. Як правіла, гэта ад 200 да 400 тысяч рублёў. Канчатковы кошт складаецца з колькасці выездаў у пэўны дзень. Паслугі гэтыя могуць аказваць і іншыя спецыялізаваныя арганізацыі. Але працуюць яны ў буйных гарадах. У невялічкіх раённых цэнтрах увесь цяжар кладзецца, як правіла, на плечы супрацоўнікаў МНС. Але мушу зазначыць, што для нас гэта не з'яўляецца спосабам дадатковага заробку. Проста мы такім чынам кампенсуем выдаткі на праведзеныя работы...

# АД «ЧАЙКІ» ДА «ФОРДА»



**Больш за 50 экіпажаў з Беларусі, Расіі, Літвы, Латвіі, Эстоніі прынялі ўдзел у VII Міжнародным злёце рэтра- і класічных аўтамабіляў «Рэтра Мінск-2014». Мінчане і госці беларускай сталіцы змаглі ўбачыць рэдкія аўто, якія выпускаліся больш за 50 гадоў таму на розных кантынентах нашай планеты.**

Як заўважылі аматары рэтрааўтамабіляў, у мінулыя гады ў сталіцы збіралася і больш машын, але ў гэты раз «Рэтра-Мінск» супаў са злётамі класічных аўтамабіляў, што праводзяцца ў іншых краінах. Тым не менш, экспазіцыя атрымалася яркай і сабрала мноства гледачоў. Калі меркаваць па колькасці пастаянных і новых удзельнікаў злёту, класіка аўтамабілебудавання для многіх застаецца «любоўю на ўсё жыццё».

**Марына БЕГУНКОВА. Фота аўтара.**



■ Творчы падыход

# «ЛЭДЗІ» І «МУШКЕЦЁРЫ» ПОШТЫ

**У Гродзенскім дзяржаўным прафесійна-тэхнічным каледжы прыборабудавання прайшоў ужо традыцыйны рэспубліканскі конкурс прафесійнага майстэрства будучых паштавікоў. У ім удзельнічалі 8 камандаў навучальных установаў з Мінска, Брэста, Віцебска, Гомеля, Оршы і Гродна, дзе ажыццяўляецца падрыхтоўка апаратараў паштовай сувязі.**



Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

Зразумела, што іх будучая работа, як і любая іншая, будзе рэгламентавана строгімі нормамі службовых інструкцый. Якія там пачуцці ды эмоцыі? Аднак пакуль, на конкурсе, яны «Мушкецёры пошты», «Лэдзі сувязі», «Паштовы бамонд», «Арт-пошта», «Пасланкі Гермеса», «Паштовы дыліжанс»...

Вось такія рамантычныя назвы прыдумалі для сваіх камандаў канкурсанты. І творчы падыход быў, вядома ж, не толькі ў гэтым, але і ў саміх выступленнях. Маладыя людзі натхнёна распавядалі пра сваю будучую прафесію і павагу да кліентаў. Прычым рабілі гэта вельмі шчыра, ад душы. Вось бы так заўсёды і ў рэальным жыцці! Аднак у аддзяленні сувязі, дзе я разлічваюся за камунальныя і мабільныя паслугі, амаль ніколі пасля плацяжу не пачуеш чароўнага «Калі ласка»... Не, у сэнсе фінансавага разліку ўсё нармальна, аднак той еднасці паміж паштавікамі і іх кліентамі, пра якую гаварылася на конкурсе ў Гродне, усё ж не адчуваецца. Пакуль...

А значыць, хочацца верыць: тое, пра што казалі маладыя людзі на конкурсе, яны неўзабаве зробяць нормай на сваіх рабочых месцах. Тым больш што праблем з працаўладкаваннем у дачыненні спецыялістаў паштовай справы, якіх рыхтуюць у мясцовым прафесійна-тэхнічным каледжы прыборабудавання, як адзначыла, у прыватнасці, намеснік дырэктара Гродзенскага філіяла РУП «Белпошта» Святлана Мякіш, не было і не будзе.

Дарэчы, на Гродзеншчыне, ды і ў іншых рэгіёнах рэспублікі, цяпер актыўна ўкараняюцца новыя паштовыя тэхналогіі. Адна з іх стала тэмай хатняга задання: удзельнікі конкурсу рэкламавалі паслугі лінейкі «Камфорт». Скарыстацца імі можна пры адпраўленні пісьма ці пасылкі ў любым аддзяленні паштовай сувязі, падраздзяленнях «Бізнес-пошты». Як было прадэманстравана ў конкурсных відэаролiках, такое адпраўленне кур'ер можа ўручыць адрасату ў любым месцы — напрыклад, у студэнцкім інтэрнаце ці нават на рыбалцы. Пры гэтым адпраўшчык адразу ж атрымае SMS-паведамленне аб дастаўцы.

Акрамя таго, канкурсантам прапаноўваліся тэарэтычныя і практычныя заданні, звязаныя з тэхналогіяй паштовых адпраўленняў, а таксама бліц-апытанне. Усе каманды былі ўзнагароджаны дыпломамі, сувенірамі і падарункамі ад «Белпошты». А пераможцам конкурсу стала адзіная мужчынская каманда — «Мушкецёры пошты» з Вышэйшага дзяржаўнага каледжа сувязі (г. Мінск).

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## СПАЖЫВЕЦКІЯ КРЭДЫТЫ СТАЛІ ДАСТУПНЕЙ

**Напрыканцы красавіка буйнейшым банкам краіны былі зніжаны стаўкі па крэдытах для насельніцтва на спажывецкія патрэбы, паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе Беларусбанка.**

Цяпер такія крэдыты тэрмінам да 1 года (безнаяўным пералікам на рахункі трэціх асоб) прапануюцца пад 40,5% гадавых, тэрмінам да 5 гадоў — пад 42,5% гадавых. Крэдыт на набыццё аўтамабіля тэрмінам да 5 гадоў даецца пад 43% гадавых, а на набыццё тавараў у межах заключаных дагавораў аб супрацоўніцтве з гандлёвымі арганізацыямі — пад 41% гадавых.

Акрамя таго, грамадзянам даецца магчымасць атрымаць спажывецкі крэдыт, забеспячэннем выканання абавязацельстваў па якім з'яўляецца страхаванне рызыкі незвароту крэдыту. Такія крэдыты даюцца грамадзянам, узрост якіх на момант заключэння крэдытнага дагавора не перавышае 55 гадоў для мужчын і 50 гадоў — для жанчын. Падобная пазыка прапануецца на тэрмін да 5 гадоў з выплатай за карыстанне крэдытам двухразовай стаўкі рэфінансавання Нацбанка Беларусі, якая дзейнічае на дату заключэння крэдытнага дагавора. Грошы кліент атрымае шляхам безнаяўнага пералічэння на рахункі трэціх асоб альбо банкаўскай аплатнай карткай, а максімальная сума крэдыту складае 50 млн рублёў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## УКХ-ПРЫЁМНІКІ Ў ПАДАРУНАК

**Атрымаюць ветэраны вайны Асіповіцкага і Глускага раёнаў Магілёўшчыны на Дзень Перамогі.**

Такое рашэнне прынялі мясцовыя ўлады, улічваючы тое, што менавіта гэтыя раёны стануць першымі, дзе правадное радыё заменяць на эфірнае. У Глускім раёне, дзе пражываюць 32 ветэраны, прыёмнікі будуць набыты за кошт раённай грамадскай арганізацыі «Белая Русь». Як адзначыў яе кіраўнік Андрэй Баброўнік, настроіць апарат на патрэбную частату ветэранам дапамогуць работнікі раённага вузла сувязі.

Дарэчы, як паведамілі ў Магілёўскім РУП «Белтэлекам», правадное радыёвяшчанне ў вышэйзгаданых раёнах плануецца адключыць ужо да 1 чэрвеня. Бясплатна радыёпрыёмнікі змогуць атрымаць толькі тыя абаненты, якія з'яўляюцца інвалідамі па зроку 1 і 2 груп.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## 25203 АДЦІСКАННІ — ЗА МІР

**У Віцебску ў дзень святкавання Перамогі ўдзельнікі акцыі «Адцісніся за мір» зробяць 25203 адцісканні за кожны мірны дзень. Упершыню пройдуць і іншыя цікавыя мерапрыемствы.**

У прыватнасці, пад адкрытым небам, на Алеі вайсковай славы (каля плошчы Перамогі. — **Аўт**.) можна будзе ўбачыць экспазіцыю ваеннай формы і рыштунку «Гісторыя ваеннага мундзіра». У культурна-гістарычным комплексе «Залатое кальцо г. Віцебска «Дзвіна» адкрыецца персанальная выстава палотнаў ветэрана вайны Канафія Сайфугаліева. Там жа адбудзецца святочны канцэрт «Мой мілы, калі б не было вайны». Выставу работ мастакоў Віцебска, прысвечаную перамозе ў Вялікай Айчыннай вайне, можна будзе наведаць у выставачнай зале Віцебскага цэнтра сучаснага мастацтва.

Па добрай традыцыі, у святочны дзень ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, воіны-інтэрнацыяналісты і ветэраны лакальных войнаў змогуць бясплатна наведваць музейныя экспазіцыі.

Вельмі разнастайнай будзе святочная праграма і 10 мая.

11 мая пройдуць мерапрыемствы, прысвечаныя Дню Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь, — прычым не толькі ў цэнтры, але і на ўскраінах.

Падчас трохдзённага святочнага марафону на пешаходнай вуліцы Суворава будзе працаваць выстава-кірмаш «Віцебскі вернісаж». Акрамя таго, можна здзейсніць падарожжа на цеплаходзе.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ДЛЯ БАЛЕЛЬШЧЫКАЎ — СПЕЦЫЯЛЬНЫЯ МАРШРУТЫ

**У перыяд правядзення чэмпіянату свету па хакеі — праца камунальнага пасажырскага транспарту сталіцы будзе скіравана на забеспячэнне падвозу балельшчыкаў да галоўных спартыўных арэн.**

Для дастаўкі балельшчыкаў да «Мінск-Арэны» з 9 па 25 мая арганізуюцца спецыяльныя аўтобусныя маршруты: №1С ад станцыі метро «Няміга» (інтэрвал руху 5 хвілін); № 911С і № 912 ад АВ «Цэнтральны» (інтэрвал у абодвух выпадках 15 хвілін); № 919С ад Студэнцкай вёскі (інтэрвал 5 хвілін). Тралейбусны маршрут № 10Д ад станцыі метро «Пушкінская» будзе хадзіць з інтэрвалам 6 хвілін.

Для падвозу да «Чыжоўка-Арэны» з 9 па 22 мая будзе арганізавана работа аўтобусных маршрутаў: № 913С ад АВ «Цэнтральны» (інтэрвал руху 15 хвілін); № 914С ад «Мінск-Арэны» (інтэрвал 20 хвілін); № 920С ад студэнцкай вёскі (інтэрвал 10 хвілін); № 951С ад прыпыначнага пункта Лошыца (па раскладзе, узгодненым з рухам электрацягнікоў гарадскіх ліній). Будзе абслугоўваць балельшчыкаў і тралейбусны маршрут № 926 «Ст.м. «Аўтазаводская» — «Чыжоўка-Арэна» (інтэрвал 5 хвілін).

З 8 мая па 25 мая ў перыяд з 6.00 да 24.00 арганізуецца работа прыгараднага экспрэснага маршрута № 916Э «Нацыянальны аэрапорт Мінск — АВ «Цэнтральны» — студэнцкая вёска».

З 9 па 25 мая падаўжаецца час працы тралейбусных маршрутаў №№13, 28 — да 1.00; а 22-25 мая будзе падоўжана работа аўтобуснага маршрута № 100 — да 3.00.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## 500 «БАКСАЎ» ЗА КАНЯ

**У Віцебску за зніклага каня па мянушцы Малы абяцаюць 500 долараў.**



Адпаведную аб'яву ўладальнік жывёлы размясціў на старонцы ў адной з папулярных сацыяльных сетак.

«3 мая ў 22:00 сведка бачыў, як каня вялі ў раёне Полацкага рынку», — так пачынаецца аб'ява. Далей расказваецца пра тое, дзе гаспадар шукаў каня. Знайшоўся сведка, які расказаў, што жывёлу вялі ў бок населенага пункта, які знаходзіцца каля Віцебска. Апытаў і цыган, але безвынікова.

«Цяпер надзея на выпадковых сведак. Абяцаю ўзнагароду таму, хто знойдзе, — $500», — заклікае чалавек, які шукае жывёлу.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуюць у сувязі са смерцю дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага склікання Бурака Віктара Канстанцінавіча і выказваюць шчырае спачуванне яго родным і блізкім.**

СОАО «Минский завод автомобильной комплектации»
**ОБЪЯВЛЯЕТ ТЕНДЕР НА ПРИОБРЕТЕНИЕ ЛЕНТОЧНОПИЛЬНОГО СТАНКА.**
Предложения принимаются в течение 5 дней со дня публикации по адресу: г. Минск, ул. Лынькова, 123, тел./факс 205-86-00, тел. 205-85-24 Тельтевский В.Н.
УНП 190050257

**ОАО «БЕЛХИМ» ПРИГЛАШАЕТ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ**
в процедуре переговоров по выполнению работ по объекту «Текущий ремонт эстакады участка по производству ингибированной соляной кислоты по адресу: **Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 25».**
Предложения принимаются до 09.00 15.05.2014 г. по адресу: г. Минск, ул. Короля, 34, каб. №19.
Справки по тел. 8017 204-85-17, факс 8017 204-85-19.
УНП 100122846

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

7 мая 2014 г.
№ 8 (328)

ГРАМАДСКАЯ ПАСАДА

# СТАРАСТА ПРАЦУЕ НЕ ЗА ГРОШЫ

**Стараста вёскі Лагвошчы, што за 25 км ад Жыткавіч, Кацярына Трафімовіч, амаль усё жыццё працавала паштальёнам. Таму мясцовых жыхароў ведае вельмі добра. Яны яе таксама паважаюць, па традыцыі называюць «Каця-паштарка», хоць жанчына чатыры гады як на пенсіі. Маладзейшыя часцей кажуць «Антонаўна». А яна на ўсе імёны шчыра адклікаецца.**

Калісьці вёска была вялікай, а цяпер засталося каля 90 двароў. Але ж пустуючыя дамы тут усё часцей купляюць дачнікі. Побач прыгожы бераг Случы, недалёка і Прыпяць.

— Я гэтай вёскай жыву, — кажа Кацярына Антонаўна. — Мне так шкада нашых людзей. — Яны пастарэлі, і так хочацца ім усім дапамагчы. Мне гэта зусім не цяжка, нават прыемна з імі мець стасункі. Людзі розныя бываюць, але ж трэба так з імі размаўляць, каб цябе зразумелі.

Не так даўно ў вёсцы, якая адносіцца да Юркевіцкага сельсавета, усталявалі помнік загінулым воінам. Кацярына Антонаўна арганізавала мясцовых жанчын: прыйшлі, разам дрэвы і кветкі вакол пасадзілі, тэрыторыю ўпарадкавалі. Традыцыйны клопат старасты — вясковыя могілкі. Тут з дапамогай сельсавета зрабілі агароджу. А што да навядзення парадку, Кацярына Трафімовіч кожнага перакана, што ўдзел у суботніку, у тым ліку на месцах пахавання — справа чалавечага сумлення.

— Мне хочацца, каб было чыста паўсюль. Здараецца, нехта не жадае ісці. Тады трэба знайсці падыход да чалавека... Я, нягледзячы ні на што, заўсёды пацікаўлюся, як жыццё, пагавару з кожным. У нас людзі спагадлівыя. Вось бульбу мы ўсе разам садзілі — летась суседняя гаспадарка дапамагала, сёлета — прыватнік.

А яшчэ Кацярына Антонаўна выконвае ў сваёй вёсцы функцыі... бюро даведак. Практычна няма пытання, на якое яна не знойдзе адказу. Таму і пытаюцца: куды патэлефанаваць, да каго звярнуцца па дапамогу, калі будзе пенсія?.. Што да матэрыяльнага заахвочвання старасты, яна проста не разумее — гэта за што? Але ж нарэшце ўзгадвае, што было вельмі прыемна, калі на дзень вёскі атрымала падарунак ад сельскага Савета, а ў раёне лепшых стараст прэміравалі.

— Я не думала ніколі пра тое, каб мне плацілі за гэтую работу! Проста хочацца, каб у нашай вёсцы быў парадак, каб было ўсё хораша.

Такі ж энтузіязм уласцівы і яшчэ адной старасце са стажам — Любові Стражэвіч. Да 76-гадовай жанчыны ўсе 48 жыхароў вёскі Цімашэвічы Ленінскага сельсавета Жыткавіцкага раёна ідуць па параду і дапамогу. Заатэхнік па спецыяльнасці, Любоў Раманаўна з людзьмі заўсёды ўмела ладзіць, была дэпутатам сельскага Савета чатыры скліканні запар. Гаворыць, што афіцыйна ўжо адмаўлялася ад грамадскай пасады старасты. Але ж ад людзей, якім патрэбна дапамога, не адмовішся:

— Усе аднавяскоўцы лічаць мяне старастай, хоць я сама так не лічу. Па ўсіх пытаннях звяртаюцца — праблемы ж трэба вырашаць. Летась мы прыбралі могілкі, бетонную агароджу паставілі і пафарбавалі. Хоць людзей у нас жыве і няшмат, але ж сабралі на добраўпарадкаванне могілак 16 мільёнаў рублёў. Амаль усе дапамаглі з грашыма. Мы звярталіся яшчэ і да нашчадкаў тых, чые бацькі тут пахаваныя. Некаторыя адмаўляліся, а большая частка актыўна дапамагалі. Мне за работу дыплом Гомельскага аблвыканкама з прэміяй уручылі — я вельмі задаволена. Старастаў вёсак трэба заахвочваць.

Між тым старшыня Юркевіцкага сельскага Савета Алена Шпакевіч узгадвае часы, калі грошы на сувеніры для старастаў брала са сваёй кішэні:

— У 1998 годзе ў раёне з'явіліся першыя старасты вёсак. Тады я для іх нешта за свае асабістыя грошы купляла, бо гэтыя людзі мне вельмі дапамагалі. Цяпер сродкі на заахвочванне выдзяляю па артыкулах «іншыя расходы», бо пасада старасты не аплачваецца. Але ж ніхто яшчэ не паклаў сваё пасведчанне на стол. Я ў гэтым сельсавеце працую з 1977 года. Памятаю, раней былі сельскія камітэты, але мне здаецца, значна лягчэй вырашаюцца пытанні праз аднаго актыўнага чалавека. Калі трэба, збіраем старастаў і дэпутатаў сельскага Савета разам. Паважаныя, энергічныя, ініцыятыўныя людзі старастамі на вёсцы павінны быць. Ім хоць ноччу патэлефануй, усе, як адзін, дапамогуць вырашыць праблему.

> **Абсалютная большасць з іх на грамадскай пасадзе працуюць па поклічы душы і сэрца. І ўсё ж радуюцца як дзеці, калі да маральнага заахвочвання дадаецца невялікае матэрыяльнае.**

Мы не баімся далучаць да работы моладзь, бо ў іх новае бачанне, яны маюць арыгінальныя прапановы. Сярод старастаў у нашым сельсавеце ёсць розныя па ўзросце, у тым ліку 40-гадовыя. Вучыць трэба старастаў. Сёння яны павінны быць вельмі адукаванымі, каб ведаць і на сваім месцы тонка праводзіць у жыццё дзяржаўную палітыку. Мне вельмі радасна, што нашы старасты змаглі прыцягнуць да работы нават тых людзей, якія нідзе афіцыйна не працуюць. Яны ў нас агароджы ставілі, фарбавалі іх. Для нас гэта перамога.

— Вядома, часцей за ўсё мы маем магчымасці толькі для маральнага заахвочвання вясковых старастаў, — выказвае свой погляд на праблему старшыня Жыткавіцкага раённага савета дэпутатаў Ніна Рамановіч. — Калі падводзім вынікі работы, самых лепшых узнагароджваем граматамі і ўдзячнымі лістамі. Абавязкова расказваем пра іх работу ў мясцовай прэсе. Як правіла, старастамі выбіраюць актыўных. Шмат дзе такой працай займаюцца прадаўцы, былыя кіраўнікі школ, настаўнікі. Добра, калі стараста даўно жыве ў сваім населеным пункце і добра ведае ўсіх людзей. У нас у кожным сельсавеце такія старасты, без якіх нельга ніякую справу добра наладзіць. Нядаўна суботнікі праходзілі. Мне расказваюць, у Чэрнічах адна з жанчын спачатку адмовілася выходзіць на грамадскія работы, дык стараста яе так прысароміла, што тая адразу ж пайшла працаваць. Значыць, ёсць аўтарытэт у вясковых «мэраў»!

Старасты ў Жыткавіцкім раёне займаюцца ў тым ліку і зборам сродкаў — самаабкладанне — пад пэўны сацыяльны праект. Потым менавіта яны трымаюць справаздачу перад людзьмі — на што іх грошы патрачаны. Абсалютная большасць з іх на грамадскай пасадзе працуюць па поклічы душы і сэрца. І ўсё ж радуюцца як дзеці, калі да маральнага заахвочвання дадаецца невялікае матэрыяльнае.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

**ОАО «БЕЛХИМ» ПРИГЛАШАЕТ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ**
в процедуре переговоров по выполнению работ по объекту
«Изготовление и установка окон ПВХ на Фанипольской базе ОАО «Белхим»,
расположенной по адресу:
**Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 25».**
Предложения принимаются **до 14.00 13.05.2014 г.**
по адресу: **г. Минск, ул. Короля, 34, каб. № 19.**
Справки по тел. 8017 204-85-17, факс 8017 204-85-19. УНП 100122846

СВАЯ АКРУГА

# У ЖЫЦЦІ ДРОБЯЗЯЎ НЕ БЫВАЕ,

лічыць дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Аляксандр Разганаў

НЭЛІ ЗІГУЛЯ

**Што можа быць для дэпутата горшым, чым папрокі людзей у адсутнасці яго сувязі з выбаршчыкамі? Маўляў, бачылі мы цябе толькі раз у жыцці, і тое на плакаце падчас выбараў. Аляксандр Разганаў на тэрыторыі сваёй выбарчай акругі № 88, у якую ўваходзіць частка Магілёва, а таксама Магілёўскі, Чэрыкаўскі і Чавускі раёны, асоба вядомая. Нездарма ж ужо другі тэрмін запар прадстаўляе інтарэсы сваіх землякоў у вышэйшым заканадаўчым органе дзяржавы. Нядаўна мы мелі магчымасць паназіраць за тым, як ён працуе са сваімі выбаршчыкамі.**

## Адлегласць — не перашкода

Яшчэ да пачатку прыёму ў Вейнянскім сельсавеце Магілёўскага раёна паспела пагутарыць са старшынёй Святланай Сцішанковай. Пад яе «наглядам» — 8 населеных пунктаў, дзе пражывае каля 5,5 тысячы чалавек. Усе людзі розныя, у кожнага свае патрэбы. І калі б не Аляксандр Разганаў, то старшыні, з яе невялікім стажам працы ў органах прадстаўнічай і адначасова выканаўчай улады пярвічнага ўзроўню было б цяжка. Аляксандр Іванавіч жа, сцвярджае Святлана Уладзіміраўна, першы памочнік і дарадчык. З яго дапамогай вырашаліся пытанні, якія, здавалася, немагчыма было зрушыць з месца.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*



Прыём вядзе Аляксандр РАЗГАНАЎ. Зямельнае пытанне аказалася самым складаным.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ТЭМА ДНЯ

# ЗАМЕСТ НЕКАЛЬКІХ — АДЗІН

## Спрашчаецца механізм аплаты падаткаў

ТАЦЦЯНА ЛАЗОЎСКАЯ

**Пра работу тэрытарыяльных падатковых органаў, удасканаленне механізму аплаты грамадзянамі падатку на нерухомасць і зямельнага падатку ў сельскай мясцовасці расказаў старшыням пасялковых і сельскіх Саветаў дэпутатаў начальнік галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Міхаіл Расолька. Сустрэча адбылася ў Інстытуце дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Беларусі.**

На ўліку ў падатковых органах — больш як 2 млн 900 тыс. плацельшчыкаў зямельнага падатку і падатку на нерухомасць. У тым ліку палова з іх мае права на льготу. Напрыклад, ваенныя тэрміновай службы, удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, пенсіянеры па ўзросце, інваліды I і II груп, іншыя непрацаздольныя грамадзяне, члены шматдзетных сем'яў, асобы, якія пастаянна пражываюць у вёсцы і працуюць у арганізацыях, размешчаных у сельскай мясцовасці, а таксама ва ўстановах культуры, аховы здароўя, адукацыі і сацыяльнай абароны, што знаходзяцца там. Сюды адносяцца і былыя работнікі гэтых арганізацый пасля выхаду на пенсію.

> **Мясцовым Саветам дэпутатаў трэба падыходзіць да прадастаўлення льгот з улікам канкрэтнай сітуацыі.**

### Ільготы не для ўсіх

Але і тут ёсць пэўныя тонкасці. Напрыклад, дзеці будуюць дом каля Мінска, прапісваюць туды састарэлых бацькоў, якія маюць права на льготы. Але фактычна пражываюць у ім самі. Яшчэ адзін нюанс: ільгота належыць інвалідам і пенсіянерам, калі разам з імі не зарэгістраваны працаздольныя грамадзяне. Але здараецца і так, што разам з бацькам і маці жыве сын, які не прыносіць у дом нічога, акрамя клопату: нідзе не працуе, злоўжывае алкаголем. У гэтым выпадку пенсіянеры губляюць ільготу. «Менавіта таму мясцовым Саветам дэпутатаў трэба падыходзіць да прадастаўлення льгот з улікам канкрэтнай сітуацыі», — заўважыў прадстаўнік Міністэрства.

Летась было налічана 490 млрд рублёў маёмасных падаткаў (зямля і нерухомасць), з улікам прэферэнцый прад'яўлена да аплаты каля 250 млрд рублёў. У разліку на аднаго чалавека сярэдняя сума падатку на нерухомасць па краіне склала 140 тыс. рублёў за год, на зямлю — 50 тыс. рублёў. Па Мінску — адпаведна 200 і 400 тыс. рублёў.

Найбольшая колькасць плацельшчыкаў падатку на ўліку ў Мінскай вобласці — 740 тыс. чалавек. У Брэсцкай — 482, Гомельскай — 431, Віцебскай 398, Гродзенскай і Магілёўскай прыкладна па 350, у Мінску — 147 тысяч.

> **Плануецца адаптаваць памер зямельнага падатку да рыначных цэн — у залежнасці ад кадастравай ацэнкі зямлі.**

### Чым прасцей, тым лепш

Механізм вылічэння падаткаў даволі працаёмкі, патрабуе як фізічных намаганняў, так і матэрыяльных затрат. Разам з тым у выніку аптымізацыі колькасць работнікаў падатковых органаў зменшылася на чвэрць, у раённых інспекцыях працуе па 8-9 чалавек. Сёння шмат робіцца па спрашчэнні, удасканаленні працэсу разліку падаткаў. Згодна з заканадаўствам, кожны грамадзянін павінен атрымаць паведамленне з пазначаным памерам падатку, які належыць аплаціць. Да ведама, кошт аднаго такога пісьма летась склаў 10 тыс. рублёў. Для скарачэння затрат падатковыя органы практыкуюць уручэнне карэспандэнцыі старшыням ці казначэям садовых таварыстваў.

— Сёлета заключылі дагавор на паслугі з «Белпоштай». У электронным выглядзе інфармацыя, што тычыцца плацельшчыкаў, перадаецца паштавікам, якія, у сваю чаргу, друкуюць паведамленні аўтаматызаваным спосабам. Такім чынам сёлета будзе сфармавана 50% паведамленняў прыкладна для 1 млн грамадзян. Сістэма закране асобныя раёны ўсіх абласцей. З гэтага года фізічныя асобы з іх згоды змогуць таксама атрымліваць паведамленні на электронную скрыню, — канстатаваў Міхаіл Расолька.

### Для зручнасці плацельшчыкаў

Некалькі гадоў таму старшыні сельскіх Саветаў скардзіліся, што падатковыя органы ўскладаюць на іх частку функцый па вылічэнні падаткаў. «Ніхто вас цяпер не прымушае прымаць грошы ад плацельшчыкаў», — заўважыў Расолька.

Заканадаўства дае грамадзянам права выбару: унесці налічэнні ў аддзяленне банка, пошты, падатковы орган. Але калі іх няма ў вёсцы? Зразумела, што чалавеку прасцей заплаціць па месцы жыхарства, у сельскім Савеце, чым ехаць у райцэнтр.

— Вы абраныя народам, а мы знаходзімся на дзяржаўнай службе. І ў нас агульная зацікаўленасць у тым, каб чалавеку было зручна, — звярнуўся да слухачоў Міхаіл Расолька. — Абсалютная большасць старшынь сельскіх Саветаў ідзе нам насустрач, за што ім вялікі дзякуй. І калі ў вас ёсць такая магчымасць, дапамажыце нам. У любым выпадку сродкі паступяць у мясцовы бюджэт.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

# ВЯСЕЛЬНЫ КРЭАТЫЎ

**Полацк, які вядомы сваімі крэатыўнымі фэстамі і акцыямі, цяпер здзіўляе будучых маладажонаў.**

— У рамках святкавання Дня горада, з 17 па 18 мая, упершыню будзе рэалізаваны крэатыўны забаўляльны праект «Як правесці выхадныя ў г. Полацку». Мэты праекта: псіхалагічная падрыхтоўка да вяселля, прапаганда сямейнага жыцця, дэманстрацыя годнага прыкладу арганізацыі вольнага часу моладзі ў найстаражытным гасцінным горадзе, — паведамілі ў аддзеле ідэалагічнай працы, культуры і па справах моладзі Полацкага райвыканкама.

Будучыя муж і жонка, якія ўжо падалі заявы ў ЗАГС, запрашаюць да сябе ў госці маладую пару з Оршы, каб разам правесці ў Полацку два дзіўныя дні. Гасцям сумна не будзе. У праграме экскурсійны пешы шпацыр, падчас якога можна ўбачыць помнікі Францыску Скарыну, Сімяону Полацкаму, літары «Ў», Еўфрасінні Полацкай і іншыя. Вельмі цікава будзе прайсціся па знакамітым «чырвоным мосце», убачыць Барысаў камень каля Сафійскага сабора, дзе, па традыцыі, закаханыя выпускаюць у нябёсы галубоў.

Мужчынам прапануюць наведаць музей сярэднявечнага рыцарства, майстар-клас валодання мячом. А дзяўчаты змогуць азнаёміцца з мастацтвам усходняга танца. У праграме яшчэ нямала сюрпрызаў. Напрыклад, майстар-клас верхавой язды.

Безумоўна, ідэя мае шанц стаць папулярнай і стане чарговым добрым гарадскім брэндам.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

ІНТЭРВ'Ю НА НОВАЙ ПАСАДЗЕ

Міхаіл ПАРТНОЙ:

# «ВЫБАРШЧЫКІ ПАВІННЫ ВЕДАЦЬ, ШТО РОБІЦЬ ІХ ДЭПУТАТ»

**Наш карэспандэнт папрасіў Міхаіла Партнога, нядаўна абранага на пасаду старшыні Віцебскага гарадскога Савета дэпутатаў, падзяліцца планамі на будучыню.**



— Выбаршчыкі павінны ведаць, што робіць іх дэпутат. І я — не выключэнне. Тыя людзі, якія нас выбралі, павінны бачыць, што мы апраўдваем іх давер. Яны чакаюць ад нас, каб мы пачалі — і пажадана як мага хутчэй — вырашаць праблемы, якія іх хвалююць. Дэпутатаў адразу папярэдзіў: народ нас выбраў, таму не буду шкадаваць ні сябе, ні вас. Спатрэбіцца, і ў суботу, нядзелю будзем працаваць. Думаю, што дэпутаты справяцца. Нават упэўнены ў гэтым. Сярод іх — годныя, высокапрафесійныя людзі, якія карыстаюцца заслужанай павагай у землякоў. На працягу першага тыдня дзейнасці народныя выбраннікі ў складзе камісій займаліся, так бы мовіць, ацэнкай абстаноўкі. А потым упершыню будуць распрацоўваць і рэалізоўваць адпаведныя «вузкія» праграмы развіцця: прамысловасці і эканомікі, горадабудаўніцтва і гэтак далей, — расказвае Міхаіл Партной.

Паводле яго слоў, спачатку гарсавет павінен падтрымаць намаганні гарвыканкама, адміністрацый трох раёнаў Віцебска ў пытанні як развіцця прамысловасці, так і эканомікі ў цэлым.

— Безумоўна, развіваць прамысловасць — гэта задача выканкама. А мы — прадстаўнічая ўлада — будзем дапамагаць у гэтым. У адпаведнай сфарміраванай камісіі гарсавета — вопытныя кіраўнікі, якія ведаюць, што можна зрабіць, каб рэанімаваць прадпрыемства, наладзіць эфектыўную дзейнасць. Дарэчы, упэўнены: трэба пераламаць свядомасць наконт таго, што дэпутаты могуць выконваць толькі прадстаўнічыя функцыі. Таму на пасяджэнні камісій будзем запрашаць кіраўнікоў і выслухоўваць іх, цікавіцца: колькі людзі зарабляюць, што робіцца, каб у інтэрнатах быў зроблены рамонт і г.д.

Калі прадпрыемствы будуць дынамічна развівацца — гарадская казна будзе больш напаўняцца падаткамі. У выніку можна будзе вырашаць многія актуальныя праблемы, якія хвалююць гараджан: рамонт жылых дамоў, добраўпарадкаванне двароў, рамонт дарог і гэтак далей. У савецкі час Віцебск быў найбуйнейшым прамысловым цэнтрам, які ў тым ліку працаваў і на абаронную прамысловасць. Трэба надаць імпульс развіццю вядомых на ўвесь былы СССР прадпрыемстваў «Віцязь», «КІМ» і іншых. Сёння многія буйныя прадпрыемствы працуюць неэфектыўна. Але патэнцыял ёсць, і трэба яго выкарыстоўваць. Калі прадпрыемствы будуць выпрацоўваць канкурэнтаздольную прадукцыю, яны змогуць выплачваць добрую зарплату работнікам... І людзі чакаюць гэтага ад улады, — працягвае старшыня гарадскога Савета.

У яго вельмі цікавыя планы наконт развіцця фізічнай культуры ў абласным цэнтры. Паколькі раней адказваў за развіццё фізкультуры, спорту і турызму, гэтая тэма, зразумела, стала вельмі блізкай.

— На Віцебшчыне добра наладжана праца па развіцці спорту вышэйшых дасягненняў. Калі з 2005 па 2009 год рэгіён быў у гэтым пытанні на апошнім месцы, летась па выніках удзелу спартсменаў у чэмпіянатах Свету і Еўропы — 3 месца, у рэспубліканскіх спаборніцтвах — 4-е. А ў агульным заліку дзелім 2 і 3 месцы з Гомельскай вобласцю. У скарбонцы рэкордаў, устаноўленых у мінулым годзе, ад Віцебшчыны — 87. Што тычыцца турызму, Віцебск летась па тэмпе росту паслуг дасягнуў узроўню 126%. Больш як 20 мільёнаў долараў горад зарабіў на прыёме турыстаў толькі ў 2013 годзе.

А развіццём масавай фізкультуры трэба заняцца шчыльна. Пасля рэвізіі ўсіх дваровых пляцовак прывядзём іх у парадак. І, паверце, шмат грошай для гэтага не спатрэбіцца, — падзяліўся планамі старшыня гарсавета.

Актывізуе сваю працу і гарадскі фізкультурна-спартыўны клуб, які мае ўжо немалы вопыт арганізацыі заняткаў. У Віцебску будзе папулярызавацца гімнастыка на вуліцы. Што да пляцовак пад адкрытым небам — ужо ў хуткім часе прэзентуюць эксперыментальны спартыўны гарадок у мініяцюры.

> **У Віцебску будзе папулярызавацца гімнастыка на вуліцы. А ўжо ў хуткім часе прэзентуюць эксперыментальны спартыўны гарадок у мініяцюры.**

— Днямі буду эскіз зацвярджаць. Уявіце сабе пляцоўку памерамі, напрыклад, 400 квадратных метраў, дзе ёсць розныя трэнажоры. Апошнія зробяць фактычна з металалому: труб, якія выкарыстоўваліся ў падземных камунікацыях, і гэтак далей. Вядома, будуць і драўляныя элементы. Рэалізаваць праект у натуры плануем пры дапамозе працоўных цэхаў эксперыментальных участкаў прадпрыемстваў. Пафарбаваць і ўсталяваць такі гарадок можна і падчас суботніка. Апрабуем, а потым, можа, арганізуем маленькае прадпрыемства, каб выпуск такіх гарадкоў паставіць на паток. Што датычыцца бяспекі падчас заняткаў у такім гарадку, у Віцебску мы знайшлі самавука, які па прыдуманай ім тэхналогіі перапрацоўвае непатрэбную гуму. Гумавая крошка стане асновай для падлогі. І няхай людзі розных узростаў займаюцца, каб быць здаровымі і прыгожымі!

Любімы гараджанамі парк адпачынку на беразе ракі Віцьба, у гонар якой назвалі Віцебск, здзівіць у ліку іншага... лебедзямі. Гэтых прыгожых птушак спецыяльна прывязуць у Віцебск. Дамкі для іх ужо зроблены. Калі белых можна ўбачыць і цяпер, чорныя лебедзі стануць прыемным сюрпрызам для гараджан і гасцей горада.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

СЕСІЯ

# ПРА САМАЕ ВАЖНАЕ

**Задачы дэпутацкага корпусу былі абмеркаваны на другой сесіі Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў.**

## Ініцыятыву падтрымаюць

Рэаліі такія, што колькасць сельскіх жыхароў у нашай краіне няўхільна скарачаецца, і таму даводзіцца аптымізаваць структуру органаў мясцовага кіравання. Гэта вядзе да ліквідацыі адных і тэрытарыяльнага ўзбуйнення іншых сельсаветаў. Аднак праблем менш не становіцца. Сельскае насельніцтва старэе, а значыць, узрастае патрэба ў сацыяльнай абароне, медыцынскім абслугоўванні. Улічваючы, што ў сельвыканкамах сёння працуюць усяго два-тры спецыялісты, бачыць праблемы людзей, сігналізаваць пра іх, садзейнічаць іх своечасоваму вырашэнню могуць дэпутаты, якія жывуць побач. Усе яны без выключэння павінны працаваць актыўна, каб у мясцовых Саветаў не было «слабых звёнаў», фармалізму ў рабоце.

— Чакаем ад народных выбраннікаў максімальнай аддачы, са свайго боку гарантуючы максімальную падтрымку ініцыятыў, — адзначыў **старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Ігар ЖУК.**

Напрыклад, ужо стала нормай, што дэпутаты мясцовых Саветаў уваходзяць у склад аглядных камісій, якія павінны прымаць эфектыўныя меры ў тых выпадках, калі не створаны бяспечныя ўмовы пражывання пажылых людзей і інвалідаў. Штогод праводзіцца абследаванне кватэр гэтай катэгорыі грамадзян, ім дапамагаюць у рамонце печаў, электраправодкі, ва ўстаноўцы і замене пажарных апавяшчальнікаў. Аднак ці заўсёды грамадскія актывісты, дэпутаты (паводле заканадаўства, менавіта Саветы дэпутатаў каардынуюць работу органаў грамадскага самакіравання) на справе трымаюць сітуацыю пад кантролем і робяць своечасовыя захады, каб жыллё было пажаранебяспечным? Сёлета ў вобласці на пажарах загінула больш за 40 чалавек, пераважна — пажылога ўзросту. Прычым гэта здарылася не толькі з-за п'янства і непатушанай цыгарэты, але і па прычыне невыканання элементарных нормаў бяспекі.

## Заахвоціць матэрыяльна

Гродзеншчына была першым рэгіёнам, дзе аднавілі інстытут сельскіх старастаў. Эксперымент аказаўся паспяховым і распаўсюдзіўся на ўсю краіну. Сёння толькі ў Прынямонні абавязкі старастаў выконваюць 2,5 тысячы чалавек — гэта, як правіла, найбольш аўтарытэтныя на вёсцы людзі, якія з сельвыканкамам, раённай уладай стараюцца вырашаць надзённыя праблемы сваіх землякоў. І правільна робяць у тых раёнах, дзе старастаў заахвочваюць не толькі маральна (імёны многіх занесены ў Кнігу славы ці на Дошку пашаны), але і матэрыяльна.

Усе добрае і пазітыўнае трэба належным чынам стымуляваць, лічыць старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Краўцоў. Напрыклад, летась Гродзенскі абласны Савет дэпутатаў прыняў адпаведнае рашэнне і прэміраваў за работу з таленавітай моладзю 177 педагагічных работнікаў, трэнераў-выкладчыкаў па спорце (увогуле выплачана больш за 660 мільёнаў рублёў). Акрамя таго, 39 навучэнцаў і студэнтаў у мінулым годзе матэрыяльна заахвочаны па выніках алімпіяд, творчых і спартыўных мерапрыемстваў. Такія рашэнні прыняты і шэрагам раённых Саветаў дэпутатаў. Аднак не ўсімі. А падтрымліваць педагогаў і таленавітую моладзь варта ў кожным раёне.

Акрамя таго, трэба прывучаць людзей да парадку з дапамогай адпаведных конкурсаў (на лепшы двор, пад'езд, сядзібу, вуліцу) і не шкадаваць грошай на заахвочванне пераможцаў.

## Ужо не ў адзіноце

У шасці раёнах Гродзенскай вобласці (Воранаўскім, Дзятлаўскім, Іўеўскім, Лідскім, Слонімскім і Смаргонскім) пажылыя адзінокія людзі карыстаюцца такой формай узаемнай падтрымкі, як дамы сумеснага пражывання. Сутнасць заключаецца ў тым, што людзі, якім цяжка сябе абслугоўваць у сваёй хаце, утрымліваць у належным стане пячное ацяпленне, электраправодку і г. д., могуць з'ехацца ў адзін вялікі дом, які адпавядае ўсім патрабаванням бяспекі. І пражываць там у годных умовах, дапамагаючы адзін аднаму, пад патранатам сацыяльных работнікаў. Прычым, калі абсталяваць дом сумеснага пражывання ўсім неабходным (з дапамогай сродкаў бюджэту і спонсараў), бюджэтныя затраты будуць значна меншыя ў параўнанні з домам-інтэрнатам. Да таго ж людзі не знаходзяцца ў рамках пэўнага распарадку, пры жаданні можна займацца прысядзібнай гаспадаркай.

Сёлета адкрыццё такіх дамоў прадугледжана ў Ваўкавыскім, Гродзенскім, Карэліцкім, Навагрудскім, Астравецкім, Ашмянскім, Свіслацкім, Смаргонскім і Шчучынскім раёнах. Вельмі важна, адзначалася на сесіі, каб дэпутаты пасадзейнічалі на месцах у падборы адпаведных будынкаў і іх абсталяванні на сучасным узроўні. А, галоўнае, неабходна данесці гэтую інфармацыю да адзінокіх пажылых людзей.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# У ЖЫЦЦІ ДРОБЯЗЯЎ НЕ БЫВАЕ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

У Вейне, напрыклад, заасфальтаваны вуліцы Цагляная, Клубная і Савецкая, і да кожнага дома падведзены газ. У вёсцы Вільчыцы паклалі асфальт і правялі газ на вуліцы Партызанскай. «Каб мая воля, я б Разганава яшчэ і на наступны тэрмін перавыбрала, — кажа яна. — Ён жа на сваім участку ўсё ведае! І вельмі справядлівы, ніколі не сячэ з пляча, заўсёды ставіцца да пытання з розумам, не прымае неабдуманых рашэнняў».

— Я ведаю Аляксандра Іванавіча з 2002 года, і за гэты час у раёне шмат чаго зроблена пры яго дапамозе па будаўніцтве жылля, водаправода і дарог, — уключаецца ў размову **дырэктар Магілёўскага раённага ўпраўлення камунальнага будаўніцтва, дэпутат райсавета Яўген ДРАЗДОЎ,** які спецыяльна прыйшоў на сустрэчу з парламентарыем, каб абмеркаваць праблемы. — Калі Разганаў узначальваў Магілёўскі райвыканкам, была створана каманда аднадумцаў, якія маглі працаваць, не зважаючы на выхадныя ці адпачынкі. Цяпер ён у сталіцы, але пра землякоў не забывае. Дапамог вырашыць пытанне са станцыяй абезжалезвання у Вільчыцах, знайсці 5 мільярдаў рублёў з 8 неабходных на будаўніцтва дарогі ў пасёлку Губанава.



Памочнік дэпутата Фёдар Карташоў пазначае ў нататніку набалелыя «кропкі».

**ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»**

**Аляксандр РАЗГАНАЎ — дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага, чацвёртага і пятага скліканняў. Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па аграрных пытаннях. Выбіраўся дэпутатам Міжпарламенцкай асамблеі Еўразійскай эканамічнай супольнасці, членам Камісіі па аграпрамысловай палітыцы, прыродакарыстанні і экалогіі.**

### Барацьба супраць сабак...

Да пачатку прыёму застаюцца лічаныя хвіліны, але, як ні дзіўна, мясцовыя жыхары не выстройваюцца ў чаргу. Калі і заходзяць, то больш павітацца з дэпутатам. «А тое, што вострых праблем няма, дык гэта ж добра, — тлумачыць Святлана Сцішанкова. — Значыць яны вырашаюцца аператыўна на мясцовым узроўні».

Пачуўшы, што прымае Разганаў, у сельвыканкам завітала мясцовая пенсіянерка, якую турбуе сітуацыя з бадзяжнымі сабакамі. Па яе звароце ў аграгарадку ўжо правялі адлоў, але жыхарку гэта не задавальняе. Прапанову трымаць асабістую «жучку» на прывязі жанчына прапускае міма вушэй. Свая — гэта адно, а вось іншыя «пужаюць курэй». Аляксандр Разганаў між тым ставіцца да скаргі з разуменнем. І прапаноўвае пенсіянерцы прыняць удзел у чарговым адлове. Тая з задавальненнем пагаджаецца, нават гатовая паказаць месцы, дзе хаваюцца чатырохногія бадзяжкі.

Прадстаўнікі мясцовай улады, якія прыйшлі абмеркаваць з дэпутатам працоўныя моманты, адзначаюць: жанчына, вядома, мае рацыю, ды толькі яе барацьба супраць сабак стала дакучлівай. Але дэпутат заклікае да паразумення і нагадвае колішні выпадак у Бабруйску, калі зграя бадзяжных сабак ледзь не загрызла дзяўчыну. «Тое, што мы часам успрымаем жартам, можа закончыцца трагедыяй, — кажа ён. — Тады шукаем «крайніх.» Знішчэнне жывёл дэпутат лічыць не лепшым выйсцем. Але ж пакуль іншага няма: пытанне адлову і ўтрымання сабак у спецыялізаваных установах толькі разглядаецца на рэспубліканскім узроўні.

Як цяжка бывае знайсці ўзаемаразуменне з людзьмі, Аляксандр Разганаў ведае не па чутках. Да сваёй дэпутацкай дзейнасці ён доўгі час узначальваў Магілёўскі райвыканкам. Не адно кап'ё зламаў, каб прывучыць жыхароў прыватнага сектара да культуры. Цэнтральная вуліца аграгарадка Вейна калісьці нагадвала кітайскі «шанхай» — збітыя з дошак разнамасныя паветкі, паўразбураныя платы, смецце. Калі пачалося добраўпарадкаванне, Аляксандра Разганава жыхары Вейна нават... шкоднікам называлі. Але мінуў час, і на яго адрас пайшлі падзякі: вы ж нам вочы адкрылі. Традыцыя падтрымліваць парадак каля сваіх дамоў, разбіваць клумбы і даглядаць газоны прыжылася. Да прыгожага хутка прывыкаеш.

Вось і бабулька, якая аб'явіла вайну мясцовым сабакам, прызнаецца, што не паспела сваю агароджу прывесці ў парадак. Грошай не хапае, каб давесці справу да канца за адзін раз. Дэпутат на гэта заўважае, што агароджа — не галоўнае. Трэба, каб парадак быў каля дома, бо сёння шмат хто за плотам хавае сваю безгаспадарчасць.

### ...і суседзяў

У пенсіянера з Дубінкі каменем спатыкнення стаў кавалак зямлі. Так склалася, што некалькі гадоў таму зямлю вакол яго надзела аддалі мясцоваму фермеру, і пенсіянеру, як ён сцвярджае, стала цяжка дабірацца да ўчастка. З суседам па-добраму дамовіцца не ўдалося, і мужчына выйшаў на сцяжыну вайны. Куды толькі ён не звяртаўся са сваёй скаргай: і да мясцовых улад, і ў газету, і ў абласныя інстанцыі. Пенсіянеру прапаноўвалі іншы надзел, але яго гэта не задаволіла. Ён лічыць, што ад яго проста адмахнуліся. Аляксандр Разганаў, не ставячы пад сумненне справядлівасць і кампетэнтнасць сваіх калег, якія займаліся гэтай «зямельнай» справай, пабяцаў разабрацца. Нават калі заяўнік «перагінае палку», трэба да канца зразумець, чым ён кіруецца. У чалавека не павінна заставацца адчування, што яго ігнаруюць. Калі ён не мае рацыі, трэба даць гэта зразумець.

> **Нават калі заяўнік «перагінае палку», трэба да канца зразумець, чым ён кіруецца. У чалавека не павінна заставацца адчування, што яго ігнаруюць.**

### Чым тэрыторыя «дыхае»

— Дэпутаты розных узроўняў павінны быць на сувязі, — упэўнены Аляксандр Разганаў. — Дзякуючы Святлане Сцішанковай, Яўгену Драздову і іншым маім паплечнікам я заўсёды ведаю, чым «дыхае» той жа Магілёўскі раён. З іншымі раёнамі, якія адносяцца да маёй акругі, таксама ёсць цесныя кантакты. Гэтыя сувязі напрацаваны яшчэ ў былыя гады, калі я знаходзіўся на розных кіруючых пасадах. Я ні ад каго не ўтойваю нумар свайго тэлефона. Калі чалавек пазваніў ноччу, значыць, у гэтым была патрэба. Мне сорамна, калі я, сялянскі сын, бацька якога ваяваў на фронце, буду сядзець склаўшы рукі і не рэагаваць на звароты людзей — якімі б недарэчнымі яны не здаваліся на першы погляд. Я шмат разоў пераконваўся: дробязяў у жыцці не бывае. Як і ў тым, што больш за ўсё цэніцца тое, што робіцца для сябе. Памятаю, як з'явілася першая клумба ў аграгарадку Усход. Я звярнуўся да іншых: а чым вы горш? З таго часу жыхары заўсёды саджаюць там кветкі.

— Дэпутату, які працуе другі тэрмін, лягчэй вырашаць пытанні?

— На другі тэрмін заўсёды больш складана ісці, чым на першы. Трэба спачатку прааналізаваць: а што ты карыснага зрабіў для сваіх землякоў? Калі выбраў такі шлях — служыць народу — трэба ісці ім да канца. Тое, што табе давяраюць людзі, дадае адказнасці.

— А на што часцей за ўсё скардзяцца?

— Часцей за ўсё звяртаюцца з праблемамі па водазабеспячэнні, добраўпарадкаванні дарог, з жыллёва-камунальнымі пытаннямі, — пералічвае Аляксандр Разганаў. — Шмат прыходзіцца разглядаць спраў па зямельных участках, падвозе людзей. Вядома, адзін дэпутат такія праблемы вырашыць не можа — у яго няма фінансавых сродкаў. Разам з выканаўчай уладай абмяркоўваем пытанні і шукаем шляхі вырашэння. Сёлета нарэшце «знімаем» праблему па каналізацыі ў вёсцы Махава. А летась забяспечылі вадой і газіфікавалі вёску Сялец. Тое, што я быў кіраўніком раёна, вельмі дапамагае. На прыёме з выбаршчыкамі адчуваю сябе ўпэўнена, адразу разумею, чым і як можна дапамагчы. А вось ад пустых абяцанняў устрымліваюся — інакш ніякага даверу не будзе.

### Заўсёды даступны

— Для дэпутата мясцовага ўзроўню вельмі важная падтрымка калег вышэйшага звяна, — лічыць **старшыня Радамлянскага сельскага Савета Чавускага раёна Андрэй РАГУЕЎ**. — І я вельмі ўдзячны за тыя парады і дапамогу, якія дае Аляксандр Разганаў. Дзякуючы яму шмат карыснага зроблена для насельніцтва. Аднойчы адмянілі пятнічны аўтобусны рэйс Чавусы—Радамля, які карыстаўся папулярнасцю. Але пасля таго, як умяшаўся Разганаў, рэйс вярнулі. З дапамогай Аляксандра Іванавіча ўдалося адрамантаваць некалькі вуліц, якія знаходзіліся ў вельмі дрэнным стане. А за мінулыя 2 гады зрабілі добрую асфальтаваную дарогу ад нашага аграгарадка да Чавусаў. Да гэтага тут была звычайная гравійка — нягледзячы на тое, што ў 2006 годзе вёска атрымала статус аграгарадка. Мне імпануе, што Аляксандр Іванавіч заўсёды застаецца даступным і нос, як некаторыя іншыя, не задзірае. Таму і выбаршчыкі ставяцца да яго з асаблівымі даверам і павагай.

— Сваім аптымізмам ён заражае ўсіх, — дапаўняе калегу **старшыня Чэрыкаўскага райсавета Ганна ЦІХАНАВА.** — Да яго людзі ідуць і з асабістымі пытаннямі, і проста павітацца. Ён з усімі добразычлівы і ўважлівы. Калі б усе дэпутаты такімі былі, мы б праблем не ведалі!

# ЗАМЕСТ НЕКАЛЬКІХ — АДЗІН

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Бясспрэчна, сельскія Саветы зацікаўлены, каб паступленні дайшлі да іх як мага раней. Паводле заканадаўства, апошні тэрмін аплаты падаткаў — 15 лістапада. Міністэрства па падатках і зборах рэкамендуе грамадзянам разлічвацца раней.

Старшыня Блонскага сельскага Савета дэпутатаў Пухавіцкага раёна Алена Гнядзько выказала думку, што пры зацвярджэнні бюджэту на будучы год варта прадугледзець тэрміны аплаты да 1 кастрычніка, а за пратэрміноўку ўвесці жорсткія штрафныя санкцыі. А то атрымліваецца часам, што старшыням сельвыканкамаў даводзіцца... уносіць сумы падаткаў за тых, хто своечасова не разлічыўся, са сваёй зарплаты. Тут можа і мільён набегчы.

Але Міхаіл Расолька лічыць, што ў асноўным грамадзяне плацяць маёмасны падатак своечасова. На канец года запазычанасць складае менш як 0,3%. А адміністрацыйная адказнасць за затрымку прадугледжана. Ды і як супаставіць, напрыклад, 10 тыс. падатку, які пратэрмінаваў плацельшчык, з большым у некалькі разоў штрафам? Людзі гэтага проста не разумеюць.

Цікавіліся прысутныя і далейшай перспектывай падаткаабкладання, зменамі, якія тут прадугледжаны.

Як высветлілася, плануецца адаптаваць памер зямельнага падатку да рынайчных цэн — у залежнасці ад кадастравай ацэнкі зямлі. Цяпер разглядаецца пытанне, каб аб'яднаць зямельны падатак і падатак на нерухомасць у адзін — маёмасны падатак. У гэтым выпадку будзе ўлічвацца месца знаходжання ўчастка, аб'екты інфраструктуры, дарогі, інжынерныя сеткі. Але для гэтага патрэбны значныя ўкладанні. Пакуль мяркуецца арганізаваць пілотны эксперымент на базе Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці.

ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ

# ПЕРАД ПРОДКАМІ НЕ СОРАМНА

**За апошнія некалькі гадоў Уздзенскі раён непазнавальна змяніўся, папрыгажэў. Гэта адзначаюць і шматлікія госці, што прыязджаюць сюды. А парадак на зямлі тут наводзяць талакой: мясцовыя жыхары і ўлада, арганізацыі, прадпрыемствы, установы, дэпутаты.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Сапраўды, шмат зроблена па добраўпарадкаванні населеных пунктаў, — пагаджаецца **старшыня Уздзенскага раённага Савета дэпутатаў Ігар ПЯТРОВІЧ.** — У прыватнасці, па замене агароджаў, рамонце шахтавых калодзежаў, навядзенні чысціні на прыватных падворках. І тут варта сказаць, стараюцца самі гаспадары: абразаюць дрэвы, беляць іх, фарбуюць плот. Словам, імкнуцца, каб было не горш, чым у суседа. І гэта вельмі добра, што псіхалогія людзей мяняецца, што яны імкнуцца да чысціні ў сваім двары, вёсцы.

Свой плён прыносіць і прафілактычная работа на месцах, у кожным сельсавеце, населеным пункце. У раёне працуе штаб па навядзенні парадку, дзе вырашаюцца шматлікія пытанні, у тым ліку і па зносе пустуючых і старых будынкаў, заворванні зямельных участкаў, прыцягненні іх у севазварот. На сённяшні дзень знесена 11 дамоў, дзе ніхто не пражываў. Але гэта не мяжа, лічыць Ігар Анатольевіч, летам і восенню работа прадоўжыцца.

Як звычайна, з наступленнем вясны, напярэдадні Вялікадня, Радаўніцы, Дня Перамогі клопатаў у старшыняў сельскіх Саветаў прыбаўляецца — трэба добраўпарадкаваць грамадскія могілкі, месцы масавых пахаванняў. Але перадаваць могілкі на баланс жыллёва-камунальнай гаспадаркі ў раёне не збіраюцца. Чаму?

— У камунальнікаў і так хапае спраў. Менавіта на іх абслугоўванні свідравіны з вадой пітнога прызначэння. Яны займаюцца цэнтралізаваным зборам цвёрдых бытавых адходаў, — тлумачыць сваю пазіцыю старшыня райсавета. — Бясспрэчна, надаць могілкам адпаведны выгляд, акультурыць — справа цяжкая і адказная. Але з дапамогай службаў ЖКГ, сельскіх Саветаў, арганізацый і прадпрыемстваў, што знаходзяцца на іх тэрыторыі, нам гэта ўдаецца.

Напрыклад, усе грамадскія могілкі агароджаны. Але на некаторых, дзе гэта зроблена раней, агароджы патрабуюць замены. Сёлета ўстанавілі дабротныя бетонныя агароджы на двух могілках: у Азёрскім і Слабадскім сельсаветах. Гэтую работу плануюць працягваць і далей.

Вядома, ёсць тут і свае праблемы: частка пахаванняў знаходзіцца сярод старых, трухлявых дрэў, якія ствараюць небяспеку як для помнікаў, так і для людзей. А выдаліць такія насаджэнні — дарагое задавальненне. Па-першае, трэба выклікаць альпіністаў, якія маюць спецыяльнае абсталяванне, тэхніку. Па-другое, за кожнае спілаванае дрэва трэба заплаціць у сярэднім паўтара мільёна рублёў. Не хапае і кантэйнераў для смецця. Людзі, што наведваюць магілы сваякоў, выкідваюць непатрэбшчыну за агароджу. І гэтыя звалкі трэба своечасова разабраць.

Але тут знаходзяць выйсце з сітуацыі. У прыватнасці, прыцягваюць сельгаспрадпрыемствы, якія маюць неабходную тэхніку і пагрузчыкі. Яны і вывозяць завалы на палігоны.

Усяго ж на Уздзеншчыне 67 грамадскіх могілак. Акрамя таго, налічваецца 108 воінскіх пахаванняў, у тым ліку 104 — часоў Вялікай Айчыннай вайны, 1 — грамадзянскай вайны, 3 магілы воінаў-інтэрнацыяналістаў. Бадай, самае масавае пахаванне — на яўрэйскіх могілках каля райцэнтра. У 12 брацкіх магілах ляжыць больш як 3 тысячы чалавек: мірныя жыхары, воіны, падпольшчыкі і партызаны, знішчаныя фашыстамі. Летась тут прайшла рэканструкцыя.

Усе масавыя пахаванні замацаваны за прадпрыемствамі і арганізацыямі, якія падтрымліваюць тут чысціню і парадак, ладзяць суботнікі. Таму ўсе яны знаходзяцца ў добрым стане: пабелены, пафарбаваны. Мясцовыя ўлады таксама падтрымліваюць у гэтай справе. Сведчанне такой дапамогі — выдаткоўванне з раённага бюджэту сродкаў на замену старых помнікаў і агароджаў, добраўпарадкаванне.

— Так што нам не сорамна перад памяццю загінулых, іх дзяцей і ўнукаў, якія прыедуць на Дзень Перамогі пакланіцца праху сваіх продкаў, — падсумаваў Ігар Пятровіч.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## НОВЫЯ, БОЛЬШ УМЯШЧАЛЬНЫЯ

**Пяцівагонныя электрацягнікі рэгіянальных ліній бізнес-класа з 1 мая пачалі курсіраваць па маршрутах Мінск — Баранавічы, Баранавічы — Брэст і Мінск — Орша.**

Новыя саставы вытворчасці швейцарскай кампаніі замянілі на названых участках менш ёмістыя чатырохвагонныя цягнікі. Апошнія будуць задзейнічаны на іншых маршрутах, у тым ліку Мінск — Бабруйск. Расклад руху і кошт праезду пасля з'яўлення пяцівагонных электрацягнікоў засталіся ранейшымі.

Пяцівагоннныя электрацягнікі рэгіянальных ліній бізнес-класа, якіх цягам 2013-2014 гадоў было пастаўлена шэсць, маюць шэраг пераваг у параўнанні са сваімі папярэднікамі — чатырохвагоннымі. Як распавялі ў прэс-цэнтры Беларускай чыгункі, новыя саставы найперш больш умяшчальныя, у іх прадугледжана 302 месцы для сядзення (у чатырохвагонных — 216 такіх месцаў).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


**ЛОГОЙСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**

**сообщает о проведении 11 июня 2014 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Инженерная инфраструктура | Начальная цена, руб. | Расходы по подготовке землеустроительной документации, руб. | Задаток (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Свидно, ул. Центральная, д. 5Б 623284605201000090 | 0,1500 | электричество, водопровод | 13 010 850 | 4 737 850 | 1 301 100 |
| 2 | д. Гаище, ул. Центральная, д. 20 623284601301000107 | 0,1500 | газ, электричество, водопровод | 17 646 900 | 4 860 050 | 1 764 700 |

Задаток в размере 10% от начальной цены земельного участка перечисляется на р/с 3600619101109 в ЦБУ № 611 филиала № 500 Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Логойск, ул. Пролетарская, 1, УНН 600181577, код 04901. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой землеустроительной документации. Все участники могут ознакомиться с земельными участками и документацией на них. Иные обязанности победителя торгов и порядок проведения аукциона оговорены в условиях его проведения.

**Аукцион состоится 11 июня 2014 года в 10.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6, ком. 7. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6. Последний день приема заявлений 5 июня 2014 года до 17.00. Контактные телефоны: (801774) 54350, 55056, 55473.**

**17 июня 2014 г. в 10.00 в зале Ченковского сельисполкома по адресу: п. Ченки, ул. Октябрьская, 16**

**СОСТОИТСЯ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА**

| Адрес земельного участка | № участка (лота) | Площадь участка, га | Кадастровый номер участка | Начальная цена участка (рублей) | Размер задатка (рублей) | Расходы по организации и проведению аукциона, подлежащие возмещению победителями аукциона в бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Гомельская область, Гомельский район, п. Ченки:** | | | | | | |
| 1. ул. Зеленая, У-18 | 1 | 0,1488 | 321086808602000064 | 52 391 300 | 5 239 100 | 1 506 900 |
| 2. ул. Зеленая, У-10А | 2 | 0,1000 | 321086808602000065 | 35 209 200 | 3 520 900 | 1 506 850 |

Условия проведения аукциона:

1. К участию в аукционе допускаются граждане РБ, подавшие в комиссию в указанные в объявлении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток. Аукцион признается не состоявшимся в случаях, если: заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками; ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем.

2. Информацию о месте размещения земельных участков, характеристик их расположения, условиях развития территории можно получить по адресу: п. Ченки, Гомельский район, Гомельская область, ул. Октябрьская, 16 и тел. 8 (0232) 96 11 90, 8 (029) 139 14 59, 96 14 59; ознакомление на местности расположения участков проводится каждую среду с 8.00 до 14.00.

3. Задаток в сумме 10% от начальной цены участка в белорусских рублях на р/с 3641414240030 ЦБУ 305 ф-л 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 151501664, УНП 400178309, код платежа 04901 вносится не позднее чем за три дня до даты проведения аукциона.

4. Заявление на участие в аукционе с указанием адреса и кадастрового номера земельного участка принимаются с даты публикации извещения и заканчиваются за три рабочих дня до даты проведения аукциона по адресу: п. Ченки, ул. Октябрьская, 16 Гомельского района Гомельской области.

5. Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для каждого земельного участка.

6. Для участия в аукционе необходимо предоставить:

- заявление на участие в аукционе:
- заверенную банком копию платежного поручения, квитанцию о внесении задатка на расчетный счет;
- документ, удостоверяющий личность (паспорт), для представителей граждан — нотариально удостоверенную доверенность.

7. Местный исполнительный комитет вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до назначенной даты его проведения.

8. Сумма задатка победителя аукциона засчитывается при оплате стоимости земельного участка.

9. Победитель аукциона в 10-дневный срок оплачивает стоимость приобретенного участка, затраты на организацию и проведение аукциона, на изготовление документации по аукциону и расходы, связанные с опубликованием объявления.



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ. ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

**Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет:

**ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні;

**АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў;

**НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў;

**СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН:** 292 44 12;

**e-mail:** info@zvyazda.minsk.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 21.707. Нумар падпісаны ў 19.30 6 мая 2014 года.**

**ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**
**по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания жилого дома в г. Смолевичи, ул. Криничная**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | г. Смолевичи, ул. Советская, 125. Смолевичский райисполком, зал заседаний, 09.06.2014 г. в 15.00 |
| 3 | Продавец и его адрес | г. Смолевичи, ул. Советская, 125, Смолевичский райисполком |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | Лот № 1 – площадь 0,1343 га, кадастровый номер 624850100001000845 г. Смолевичи, ул. Криничная |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 7 | Начальная стартовая цена | Лот № 1 – 73 000 000 рублей |
| 8 | Условия аукциона | А) продажа по цене не ниже начальной; Б) участниками аукциона могут быть граждане Республике Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь |
| 9 | Наличие инженерной инфраструктуры | Электроснабжение, водоснабжение |
| 10 | Условия оплаты | За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней со дня подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11 | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10% от начальной (стартовой) цены земельного участка, главное управление Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области, р/с 3600627000007, УНП 6000537220, код банка 153001812 ЦБУ 621 филиала 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок») |
| 12 | Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемым земельным участком | Каждый четверг с 9.00 до 13.00 |

**Затраты на организацию и проведение аукциона (в том числе изготовление землеустроительного дела, осуществление государственной регистрации создания земельного участка, публикация информационного сообщения) подлежат возмещению победителем аукциона.**

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни по адресу: г. Смолевичи, ул. Подлесная, д. 11, каб. № 8.**

**Окончательный срок приема заявлений – 03.06.2014 г. 17.00.**

**Контактные телефоны: (8-01776) 5-43-55, моб. 80339027121.**

**ДЛЯ УЧАСТИЯ В АУКЦИОНЕ В АДРЕС ПРОДАВЦА НЕОБХОДИМО ПРЕДСТАВИТЬ:**

- заявление на участие в аукционе по установленной форме;
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков);
- физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

**РУП «Белпочта»**
**ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТЫХ ПОДРЯДНЫХ ТОРГОВ ПО ВЫБОРУ ПРОЕКТНОЙ ОРГАНИЗАЦИИ ДЛЯ ВЫПОЛНЕНИЯ ПРОЕКТНО-ИЗЫСКАТЕЛЬСКИХ РАБОТ НА ОБЪЕКТЕ «Строительство производственного здания по обмену и обработке авиапочты на территории Национального аэропорта «Минск».**

**Подрядные торги состоятся «09» июня 2014 года в 14.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 10.**

Контакты для получения дополнительной информации: отдел капитального строительства – тел.: 293-55-29, 293-55-28.

УНП 101015738

**ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**
**на право заключения договора аренды земельного участка для строительства производственной базы в районе пос. Усяж и установка торгового павильона ул. Коптева, дер. Плиса Смолевичского района Минской области**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | г. Смолевичи, ул. Советская, 125. Смолевичский райисполком, зал заседаний, 09.06.2014 г в 15.00 |
| 3 | Продавец и его адрес | г. Смолевичи, ул. Советская, 125, Смолевичский райисполком |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | Лот № 1 – площадь 1,2245 га, кадастровый номер 624885600003000003 район пос. Усяж. Лот № 2 – площадь 0,0729 га, кадастровый номер 624884505601000297 ул. Коптева, дер. Плиса |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельного участка | Лот № 1 – для строительства производственной базы Лот № 2 – для установки торгового павильона |
| 7 | Сроки аренды | Лот № 1 – 99 (девяноста девять) лет Лот № 2 – 50 (пятьдесят) лет |
| 8 | Сроки заключения договора аренды | После оплаты стоимости предмета аукциона в течение 2 рабочих дней |
| 9 | Начальная (стартовая) цена продажи | Лот № 1 – 298 500 000 рублей Лот № 2 – 9 228 300 рублей |
| 10 | Условия аукциона | А) продажа по цене не ниже начальной; Б) участниками аукциона могут быть индивидуальные предприниматели, юридические лица |
| 11 | Наличие инженерной инфраструктуры | Лот № 1 – Электроснабжение, газоснабжение, водоснабжение, централизованное водоотведение, асфальтированный подъезд; Лот № 2 – Электроснабжение, газоснабжение, водоснабжение, централизованное водоотведение, централизованное теплоснабжение, асфальтированный подъезд |
| 12 | Условия оплаты | За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| 13 | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10% от начальной (стартовой) цены земельного участка, главное управление Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области, р/с 3600627000007, УНП 6000537220, код банка 153001812 ЦБУ 621 филиала 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок») |

**Затраты на организацию и проведение аукциона (в том числе изготовление землеустроительного дела, осуществление государственной регистрации создания земельного участка, публикация информационного сообщения) подлежат возмещению победителем аукциона.**

**Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемым земельным участком – каждый четверг с 9.00 до 13.00.**

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни по адресу: г. Смолевичи, ул. Подлесная, д. 11, каб. № 8.**

**Окончательный срок приема заявлений – 03.06.2014 г. 17.00.**

**Контактные телефоны: (8-01776) 5-43-55, моб. 80339027121.**

**ДЛЯ УЧАСТИЯ В АУКЦИОНЕ В АДРЕС ПРОДАВЦА НЕОБХОДИМО ПРЕДСТАВИТЬ:**

- заявление на участие в аукционе;
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;
- индивидуальным предпринимателем – копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
- представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- представителем иностранного гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе индивидуальные предприниматели и юридические лица, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

**Неявка участника аукциона на аукцион признается отказом в его участии.**

■ Размовы на кухні

# ЦЕЛА ШВАРЦЭНЕГЕРА КАШТУЕ ДОРАГА,

## або Што такое доўгатэрміновыя ўкладанні ў здароўе



**Вясна заўсёды прыходзіць да нас знянацку. Яшчэ ўчора ўсе хуталіся ў палітоны, а тут раз — і май прыляцеў. Дастаем з шафы лёгкае адзенне і глядзім у люстэрка. І многія, пэўна, бачаць там вельмі «выбітных» людзей. У тым сэнсе, што некаторыя часткі выбіваюцца з агульнай карціны прыгожага, падцягнутага, натрэніраванага зімовымі вечарамі цела, якое, між іншым, у леташнюю вопратку нават не ўлазіць...**

### «КУБІКІ» НА ПУЗЕ ІМГНЕННА НЕ ЗРОБІШ

**У. К.** — Ну, не ведаю. Я вось свой гардэробчык перагледзеў — надзець магу ўсё. Не надта я памажнеў за год — і зімою з сябрамі на снезе ў футбол гулялі. А вы, відаць, толькі, як Карлсан у поўным росквіце сіл, сядзелі на дыеце з малінавага варэння. Таму і не ўлазіце ў свае шырокія штонікі...

**С. К.** — Але ж мне не 24 гады, як некаторым. Таму ў маразы я дома адпачываў. Аднак на канапе я не залежваўся. У мяне там у кутку гантэлькі стаяць. Праўда, яны крыху запыліліся... Але днямі пачаў з імі зноў сябраваць. Галоўнае — не рабіць леташніх памылак і не ісці адразу на рэкорды. А то два дні запар актыўна прэс трэніраваў, а потым тыдзень не толькі жывот, але і рэбры балелі.

**У. К.** — А мне здаецца, што ў вашы 47 не з прэса трэба пачынаць аднаўленне свайго цела, а з «дыхалкі». Пайшлі б пабегалі кіламетры з тры хаця б...

**С. К.** — Ты мне яшчэ «дзясятку» прапішы, трэнер дамарослы. Гэта ж будзе бег не ад інфаркту, а за інсультам. Маім аднагодкам да арганізма трэба больш ашчадна ставіцца. Я апошні месяц тры-чатыры прыпынкі да дому праходжу пешшу і на пяты паверх на працы без ліфта паднімаюся. У спартыўную форму трэба ўваходзіць паступова, калі нагрузкі павялічваюцца вельмі акуратна...

**У. К.** — Значыць, калі я правільна зразумеў, вы больш любіце індывідуальныя заняткі спортам у хатніх умовах. Няхай. Мне больш даспадобы калектыўныя спосабы падтрымання цяглiц — футбол, валейбол, тэніс і іншыя гульні. Вось давайце і паглядзім, чые трэніроўкі будуць больш выгаднымі для сямейнага бюджэту.

### «ІНВЕНТАРЫЗАЦЫЯ» СЯБЕ

**С. К.** — Пачынаць трэба са спартыўнай вопраткі, бо ў майках здароўе папраўляць можна на вёсцы ці на дачы. А ў горадзе фізкультура павінна выглядаць прыстойна. Як мінімум, варта абзавесціся спецыяльным абуткам. Кеды для майго малодшага сына каштуюць ад 115 да 200 тысяч рублёў. Да 300 тысяч каштуюць айчынныя красоўкі для дачок. А якасныя красоўкі для дарослых пацягнуць ужо на тысяч 500. Спартыўныя штаны для малых будуць каштаваць ад 30 да 50 тысяч. Беларускія для дарослых — 50-60 тысяч рублёў, а фірменныя — ажно да 300 тысяч.

**У. К.** — Футболкі, зразумела, у кожнага дома знойдуцца. Цяпер пяройдзем, так бы мовіць, да рэквізіту. Апошнім часам з кампаніяй гуляем у валейбол. Што для гэтага спатрэбіцца? Усяго толькі добры мяч і валейбольная сетка. Так, нармальны мяч для няспешнай гульні на прыродзе без сеткі і правілаў абыдзецца ў 150-170 тысяч. Калі ж вы гатовы пайсці ў спартыўную залу ці на спецыяльную пляцоўку, то за добры мячык (каб не збіць рукі ды не павыкручваць пальцы) давядзецца выкласці ад 230 да 300 тысяч рублёў. І, нарэшце, сетка. Тут выбар невялікі, але варыянты ўсё ж такі ёсць. Поліэстравая будзе каштаваць ад 160 да 500 тысяч, баваўняная — ад 200 да 350.

**С. К.** — Табе што, валейбол падабаецца? Гэта і не дзіва — ходзіш, як рэйка, доўгі. Сапраўдны мужык павінен быць каржакаватым, дакладней, моцным. А для гэтага «жалеза» цягаць трэба. У спецыялізаваных крамах гантэлькі нават для малых ёсць. Напрыклад, у Слуцку вырабляюць гантэлі вагой ад 1 да 12 кг. Самая маленькая каштуе 27 тысяч рублёў, а 12-кілаграмовая «жалезка» — 250 тысяч. У мяне дома дзве 8-кілаграмовыя гантэлі (173 тысячы за штуку). Для сярэднестатыстычнага гараджаніна якраз тое, што трэба. Для тых, хто хоча папантавацца, ёсць кітайскія, «абгорнутыя» ў каляровую гуму гантэлі. Нават 2 кг пацягнуць на 205 тысяч рублёў (але за пару). Ёсць у нас дома і скакалка. Яе можна набыць за 27-35 тысяч.

**У. К.** — Калі ўжо выбіраць «жалеза», то лепей, мне здаецца, узяць зборныя гантэлі. Яны больш практычныя, бо можна паступова нарошчваць нагрузку ад 4 да 10 кг. Праўда яны будуць значна даражэйшымі і чамусьці толькі кітайскай вытворчасці — ад 530 да 650 і нават 950 тысяч за штуку. Але зламаць іх цяжка, і застануцца яны ў вас на ўсё жыццё. Адным словам, доўгатэрміновыя ўкладанні. Асабіста вам я б прапанаваў увогуле ўзяць яшчэ гіру для сілавых практыкаванняў на 24 кг. Вы ж у нас асілак — што вам тыя «дзясяткі». І каштуе нармальна — усяго 490 тысяч.

**С. К.** — А што ты ўсміхаешся? Думаеш, што я такую не падніму? Мабыць, разы тры змагу, і ўсё — гасі святло. Не, калі сур'ёзна, восем мне хапае. Тут кожны павінен вызначыць сваю планку. А ўвогуле перад тым, як брацца за цяжкае «жалеза», нядрэнна было б патрэніравацьканечнасці гнуткімі трэнажорамі. Самым простым з іх будзе экспандар. Яны бываюць двух відаў — расцяжны і кісцявы. Першы будзе каштаваць ад 90 да 120 тысяч. Апошні (барысаўскай вытворчасці) абыдзецца ўвогуле ў 7250 рублёў. А падобнае гумавае колца замежнае можна набыць за 25-30 тысяч.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### «ЗАХВАРЭЦЬ» НА ГУЛЬНЮ

**У. К.** — Сумна гэта ўсё. Сядзіш, як пень, і тузаеш гумку альбо гантэль куляеш. Неяк з дзяцінства мне гэта не прыйшлося даспадобы. Хаця ва ўніверсітэце хадзілі часта ў трэнажорку — і тое не паасобку, а разам, каб весялей. Памятаю, як дзядуля са мною ўвесь час гуляў у настольны тэніс дома — во задавальненне было. На доўгі і шырокі драўляны стол мы замест сеткі ставілі кнігі і рэзаліся, як шалёныя. Можа быць, гэты гульнявы азарт ува мне так і застаўся.

**С. К.** — Я таксама са сваім шасцігадовым сынам узімку ў хаце «футбольныя» спаборніцтвы арганізоўваў. Мяч лёгкі, непрафесійны, але... Там столькі радасці было, калі малы гол забіваў. Цяпер на прыродзе мы больш складаную гульню для сябе адкрылі — бадмінтон называецца. Правілы прасцейшыя, а за паўгадзіны набегаешся і намахаешся так, што ногі потым ледзь цягаеш. І набор для гэтай гульні не асабліва шыкоўны патрэбен — моцныя ракеткі ды некалькі валанчыкаў. У краме гэта ўсё можна набыць за смешныя грошы: пара ракетак каштуе каля 70 тысяч рублёў, а валанчык — 3500. Ёсць, вядома, ракеткі пасур'ёзней — кошт можа даходзіць да 300 тысяч за штуку. А на пёравы валанчык давядзецца аддаць тысяч 6.

**У. К.** — Дарэчы, пра футбол. Таксама добры спосаб скінуць тое-сёе з бакоў. І не патрабуе асаблівых інвестыцый — патрэбны мячык ды дзве каманды. Мяч можна купіць за тысяч 300-400. Ён будзе скураны, даўгавечны. Больш бюджэтныя варыянты таксама ёсць — ад 115 да 200 тысяч рублёў. Толькі паўстае іншая праблема: дзе гуляць? Добра, калі побач ёсць школьнае поле. Але часта даводзіцца арандаваць пляцоўку — можна выкласці ад 250 тысяч да 3 млн за гадзіну. Аднак, калі ўлічыць вялікую колькасць гульцоў, то не так і дорага атрымліваецца на аднаго. А вось арэнда тэніснага корта абыдзецца значна танней — тысяч 70-100 за гадзіну можна знайсці. Бывае, наколькі я ведаю, і танней, і даражэй — як пашчасціць. Але ў гэтым відзе спорту нельга эканоміць на інвентары (ведаю на ўласным вопыце). Ракетку лепей купіць падаражэй, затое гуляць будзе прыемна і зручна. Цэны вагаюцца ад 700 тысяч да 2 млн за штуку. Мячыкі таксама варта ўзяць нятанныя, каб добра скакалі. Гульня выдатна трэніруе рукі і ногі, а таксама развівае «дыхалку» з рэакцыяй.



### ЛАДНАЕ ЦЕЛА РАБІ ЎМЕЛА

